*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою…*
Якуб КОЛАС

**№ 78 (1891)**
Серада, 5 мая 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец: УП «Народная воля».
Кошт свабодны.

# Народная Воля

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

### *Надвор'е*

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +22...+24, сонечна, уначы — +14...+16, без ападкаў; у Брэсце ўдзень — +23...+25, уначы — +14...+16 на працягу сутак — без ападкаў; у Гродне ўдзень — +22...+24, уначы — +14...+16, без ападкаў; у Віцебску ўдзень — +21...+23, сонечна, уначы — +12...+14, без ападкаў; у Гомелі ўдзень — +22...+24, сонечна, уначы — +13...+15, без ападкаў; у Магілёве ўдзень — +22...+24, уначы — +13...+15, на працягу сутак — без ападкаў.

*www.meteo.by*



**ПОЗДРАВЛЯЕМ!**



В абсолютном зачете 12-го чемпионата Беларуси по тяжелой атлетике среди ветеранов места распределились следующим образом: **Альберт ТИМЕРБАЕВ, Эдуард ЖИГАЛКО, Александр ЩЕРБАТОВ** (он поднял в толчке самую "тяжелую" штангу чемпионата — 167,5 кг), **Александр МОЛОЧКО, Владимир ХЛУД, Владимир КАВЕЦКИЙ, Александр АБРАМОВИЧ, Леонид ЯГНИШ, Станислав КРАСОВСКИЙ, Олег КОЗЛОВ, Анатолий ПОШЕЛЮК**.

*(Материал читайте на 4-й стр.)*

## У чацвер будзе разглядацца іск Тацціяны Процькі да тэлевізіёншчыкаў

У чацвер, 6 траўня, у судзе Першамайскага раёна г.Мінска адбудзецца разгляд іска Тацціяны Процькі да Беларускага тэлебачання і праграмы "В центре внимания". Пачатак пасяджэння — 10.00.

**ПУЛЬС**

## За распаўсюджванне ўлётак 15 сутак арышту

*Суд Ленінскага раёна Гродна асудзіў грамадскага актывіста Валерыя Леванеўскага на 15 сутак адміністрацыйнага арышту.*

Валерый Леванеўскі быў затрыманы 1 мая ў Гродне ля пад'езда ўласнага дома. Прычынай затрымання было распаўсюджванне ім улётак, у якіх прадпрымальнік запрашаў гараджан узяць удзел у санкцыянаваным мітынгу 1 мая.

А 3 мая быў затрыманы сын арыштаванага Леванеўскага Уладзімір, якога суд Ленінскага раёна асудзіў на 13 сутак адміністрацыйнага арышту.

**Генадзь ШАРЫПКІН.**

## Беларусі дарога ў Еўрапейскі Саюз «заказана»?

*Прэзідэнт Еўрапейскай камісіі Рамана Продзі выключае магчымасць прымання ў Еўрапейскі Саюз краін СНД. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю брытанскім СМІ.*



Спадар Продзі, у прыватнасці, паведаміў, што пасля магчымага далучэння Румыніі, Балгарыі, Турцыі і Харватыі Еўрасаюз *"можа прасоўвацца толькі ў кірунку Балкан"* з перспектывай прыёму Сербіі і Чарнагорыі, Босніі, Македоніі і Албаніі. *"І затым — стоп"*, — падкрэсліў кіраўнік Еўракамісіі, выключыўшы магчымасць прыёму Расіі, а таксама Украіны і Беларусі.

*"Каб даказаць, што Еўропа не з'яўляецца непрыступнай крэпасцю і што мы не імкнёмся проста перасунуць "жалезную заслону" на Усход, мы прапанавалі ўсім суседзям Еўрасаюза — ад Расіі да Марока — у рамках нашай праграмы "Сяброўскае кола суседзяў" раздзяліць з ЕС усё, за выняткам нашых інстытутаў,* — зазначыў Раман Продзі. — *Мы можам супрацоўнічаць у міграцыйнай палітыцы, у харчовай бяспецы, ва ўсіх магчымых галінах, але гэтыя краіны не могуць быць членамі Еўрапейскага парламента і Еўрапейскай камісіі".*

**Вольга ЛАПІКАВА.**

**ПРОТЕСТ**



# В Гродно бурлят страсти...

В первую очередь предпринимателей, возмущенных действующим законодательством, направленным на уничтожение малого бизнеса.

25 апреля хозяева частных маршрутных такси протестовали против президентского Указа №140, который ставит вне закона более половины индивидуальных предпринимателей, работающих на городских экспресс-линиях.

1 мая около трех тысяч горожан вышли на демонстрацию вовсе не для того, чтобы приветствовать городские власти.

Большая часть собравшихся — предприниматели, а также представители профсоюза "Садружнасць", ГА БНФ "Адраджэньне". Над площадью Ленина, где проходил официальный праздник, взвились бело-красно-белые стяги и флаги Евросоюза. Люди стояли с портретами президента, с лозунгами "Обещал! Обманул! В отставку!" и скандировали "Свободу, свободу, свободу!".

Шествие по улицам города продолжалось в течение нескольких часов. Милиция, одетая в парадное, наблюдала за происходящим. Демонстранты требовали освобождения Валерия Левоневского, арестованного в этот день. Отряд ОМОНа появился тогда, когда демонстранты перегородили улицу на подходах к следственному изолятору, где отбывает срок заместитель председателя общественной организации предпринимателей "Перспектива" Дмитрий Ивановский.

"Свободу Ивановскому!", — скандировали демонстранты. В стычке с охранниками правопорядка пострадала женщина-пенсионерка.

Потом люди прошли по центральной улице города. По пути следования они требовали от иностранных граждан прекратить незаконную торговлю без лицензии.

3 мая на подходах к площади двух исполкомов в Гродно с самого утра стояли машины с милиционерами. В 10 часов в городском парке собралось около двух тысяч предпринимателей для выяснения вопроса о лицензировании розничной торговли — с 1 мая торговля без лицензии запрещена. К этому сроку лишь одна треть от 6 тысяч частных торговцев Гродно подала заявления на получение лицензии.

По словам торговцев, в налоговых инспекциях вместе с уплатой налога от них требуют расписаться в уведомлении, что с 1 мая безлицензионная торговля — вне закона. Представители местной власти оказались в сложной ситуации: все, что они могут сделать — обещать не применять финансовые санкции до официального опубликования документа о продлении сроков лицензирования для розничной торговли. Но уговоры о выходе на работу уже не действуют на неоднократно обманутых людей.

Гродненские предприниматели говорят: "Мы против лицензирования! Для многих оно означает неподъемные штрафы, свертывание бизнеса и уход в безработные. Налоги заплатим тогда, когда увидим документ о продлении сроков, а потом будем бороться за отмену лицензий. Пусть наши деньги недополучат бюджетники, может быть, выйдут вместе с нами на площадь. Когда власть не хочет заниматься экономическими проблемами, зреют политические!"

**Наталья МАКУШИНА.**




*В большой митинг гродненских предпринимателей переросла официальная маевка на площади имени Ленина 1 мая 2004 года. Акция проходила в том числе и под политическими лозунгами: "Лукашенко в отставку", "Нет третьему сроку", "Дайте нам достойно жить и спокойно работать" и т.д.*

**Фото Михаила КАРНЕВИЧА и Юлии ДАРАШКЕВИЧ.**

**ПАМЯТЬ**

*Участники гражданской инициативы "Мы помним" выступили 7 апреля с обращением к гражданам Беларуси. За месяц до пятилетия трагической даты — исчезновения в 1999 году экс-министра внутренних дел Беларуси генерала Юрия Захаренко — жёны и дети пропавших призвали белорусов к участию в акциях памяти пропавших.*

*"Пять лет назад для нас, членов семей белорусских политиков и общественных деятелей, началась череда ужасных потерь: 7 мая 1999 года был похищен генерал Юрий Захаренко, экс-министр внутренних дел. 16 сентября 1999 года были похищены вице-спикер Верховного Совета Виктор Гончар и бизнесмен Анатолий Красовский. 7 июля 2000 года был похищен Дмитрий Завадский, журналист Общественного российского телевидения. Наши семьи пережили эти пять тяжелых лет во многом благодаря тому, что многие из вас были рядом с нами. Мы вместе выходили на площадь и задавали невыносимые для власти вопросы: "Где Захаренко?", "Где Гончар?", "Где Красовский?", "Где Завадский?", — говорится в обращении.*

*Светлана Завадская и Юрий Завадский (супруга и сын Дмитрия Завадского), Ольга Захаренко, Елена Захаренко и Юлия Захаренко (супруга и дети Юрия Захаренко), Ирина Красовская, Валерия Красовская и Ксения Красовская (супруга и дети Анатолия Красовского) призвали людей встретиться 7 мая в 17:30 на Октябрьской площади Минска с портретами пропавших. "Мы обязаны сделать все для того, чтобы наши дети выросли в свободной стране, в мире и достатке. Чтобы ни одна белорусская семья не познала тех трагедий, которые пришлось пережить нам. Чтобы мы могли жить и работать на благо своих семей и своей страны", — заявили они. Приводим полный текст Обращения гражданской инициативы "Мы помним".*

## Обращение гражданской инициативы «МЫ ПОМНИМ»

Мы, члены семей похищенных политиков и общественных деятелей, обращаемся к Вам, нашим соотечественникам.

В то время когда наши страны-соседи движутся по пути свободы и демократии, мы, белорусы, долгие 10 лет топчемся на месте, свыкнувшись с мыслью о том, что изменить положение вещей невозможно.

Мы не обращаем внимания на то, что наша жизнь проходит лишь в борьбе с нищетой и бесправием.

Мы забываем о том, что в нашей стране растет целое поколение, не догадывающееся, что жизнь может быть другой — безо лжи, страха и лицемерия.

Мы стараемся не обращать внимания на то, что сегодня не все дети, желающие получать образование на родном языке, имеют такую возможность

Мы покорно не замечаем, что в нашей стране практически уничтожен институт независимых средств массовой информации.

Мы игнорируем факт, что в Беларуси уничтожены ведущие общественные организации.

Нашу волю сковал страх.

Пять лет назад для нас, членов семей белорусских политиков и общественных деятелей, началась череда ужасных потерь:

7 мая 1999 года был похищен генерал **Юрий ЗАХАРЕНКО**, экс-министр внутренних дел.

16 сентября 1999 года были похищены вице-спикер Верховного Совета **Виктор ГОНЧАР** и бизнесмен **Анатолий КРАСОВСКИЙ.**

7 июля 2000 года был похищен **Дмитрий ЗАВАДСКИЙ**, журналист Общественного российского телевидения.

Наши семьи пережили эти пять тяжелых лет во многом благодаря тому, что многие из вас были рядом с нами. Мы вместе выходили на площадь и задавали невыносимые для власти вопросы: "Где Захаренко?", "Где Гончар?", "Где Красовский?", "Где Завадский?". Эти вопросы будут звучать до тех пор, пока не будет известна судьба наших близких и родных.

Сегодня нам необходимо сломать инертность и безволие, и показать, что белорусы хотят того же, чего хотят все народы — свободы и демократии. Сегодня мы должны продемонстрировать это не только всему цивилизованному миру, но и самим себе. Этот год должен стать для нас всех годом преодоления — преодоления неверия, преодоления пассивности и равнодушия.

Мы обязаны сделать все для того, чтобы наши дети выросли в свободной стране, в мире и достатке. Чтобы ни одна белорусская семья не познала тех трагедий, которые пришлось пережить нам. Чтобы мы могли жить и работать на благо своих семей и своей страны.

Встретимся 7 мая в 17:30 на Октябрьской площади Минска и скажем: МЫ ПОМНИМ!

*Члены гражданской инициативы* **"Мы помним":**

**Светлана ЗАВАДСКАЯ,**
**Юрий ЗАВАДСКИЙ,**
**Ольга ЗАХАРЕНКО,**
**Елена ЗАХАРЕНКО,**
**Юлия ЗАХАРЕНКО,**
**Ирина КРАСОВСКАЯ,**
**Валерия КРАСОВСКАЯ,**
**Ксения КРАСОВСКАЯ.**

**ХОТИМ ЗНАТЬ ПРАВДУ!**
**Юрий ЗАХАРЕНКО**
**7 мая 1999 года похищен при невыясненных обстоятельствах**
**7 мая**
**Октябрьская площадь**
**17.30**
**живая цепь неравнодушных людей**

**ГРОМКАЯ ТЕМА**

# Дело Маринича

В четверг, 6 мая, Михаила Маринича должны выпустить на свободу. Или официально обвинить в совершении ряда преступлений.

А пока он по-прежнему в СИЗО КГБ.

В минувшие выходные Белорусское телевидение, в распоряжение которого были предоставлены некоторые материалы КГБ, представило отдельные подробности дела Маринича. Так, по БТ сообщили, что в гараже экс-претендента в президенты Беларуси обнаружены четыре компьютера, полученные по линии американского посольства для создания региональной сети организации "Деловая инициатива".

Помощник Маринича **Людмила Гумар** говорит, что компьютеры действительно были получены по гранту. Но это не преступление.

*"А оказались они в гараже потому, что, когда их доставили, нас в срочном порядке попросили освободить офис на проспекте Скорины, 40,* — рассказывает Людмила Ивановна. — *Сотрудники правоохранительных органов, кстати, видели, что компьютеры стояли в нашем офисе. Когда офис попросили освободить, мы всю технику, какие-то бумаги отвезли в гараж Михаила Афанасьевича. А куда их было девать? Офиса у нас нет до сих пор. Некоторые компьютеры мы на самом деле должны были передать региональным объединениям, но не могли этого сделать: региональные и международные отделения у нас на учете не состояли из-за некоторых недоразумений с Министерством юстиции".*

Что касается секретных документов, которые якобы изъяли у Маринича, то весьма любопытный комментарий по этому поводу дала Радио "Свабода" одна из бывших сотрудниц Министерства внешнеэкономических связей, которое в 90-х годах возглавлял Маринич. По ее словам, когда Министерство внешнеэкономических связей ликвидировали и объединили с МИДом, его архив не приняли, потому как *"в архиве МИДа не было места"*. Тогда Михаил Маринич мог запросто часть документов отвезти на дачу *"для мемуаров"*. Не исключено, что именно эти документы КГБ сегодня называет *"секретными"*.

Многие по-прежнему связывают арест Маринича с его президентскими амбициями. Экс-сотрудник Администрации президента **Александр Федута** считает иначе и выдвигает свою оригинальную версию случившегося.

*"Очевидно, что причиной ареста вовсе не служат какие-либо президентские амбиции Михаила Афанасьевича,* — утверждает он в своей статье на сайте www.nmn.by. — *Сегодня можно с уверенностью говорить о том, что Маринич имел бы крайне мало реальных возможностей всплыть вновь в качестве главного оппозиционного кандидата на выборах 2006 года... Старая номенклатура, эти матерые хозяйственники, прошедшие школу, аналогичную школе Мясниковича — Ермошина — Маринича et cetera, привыкли создавать собственность. Но одновременно все они с разной долею успеха создавали и самих себя — накапливая связи с потенциальными инвесторами, обретая управленческий опыт, притираясь друг к другу в ходе взаимных компромиссов. Сейчас оказалось, что весь этот формально никак не материализованный результат имеет огромную цену. Связи сохраняют вес, заменяя, в ряде случаев, собственный капитал. Арест Маринича — знак той части белорусской номенклатуры, которая потенциально могла бы использовать свои личные контакты для привлечения в белорусскую экономику реальных инвестиций, тем самым воспрепятствовав тому, что принято называть "чиновничьей приватизацией". Поскольку "чиновничья приватизация" — это вовсе не приватизация бывшими либо действующими государственными служащими крупных пакетов акций государственных предприятий, а, скорее, приватизация их без учета реальной собственности и реальных нужд приватизируемых объектов. Короче говоря, это — тот вид приватизации, при котором не деньги вкладываются, а собственность разбазаривается. И Маринич, с его прошлым крупного столичного руководителя, министра внешнеэкономических связей, дипломата, мог привести на белорусский рынок акций людей, которые готовы были бы вкладывать деньги в расчете не на немедленные, а на долгосрочные дивиденды. Во всяком случае, такие были шансы и такие, насколько я знаю Михаила Афанасьевича, были планы.*

*Арест Маринича должен был засвидетельствовать главное: старая белорусская номенклатура больше не будет активно играть на экономическом поле. Каждого, кто попытается проявлять наличие собственной воли, демонстрировать свою деловую инициативу, будут бить по рукам и если не сажать в тюрьму, как полного тезку М.А. Булгакова (вот ведь дьявольские совпадения!), то, по крайней мере, "опускать" иными способами, имеющимися в ассортименте тех, кто все еще удерживает власть.*

*Повторюсь — это всего лишь версия..."*

Руководитель исследовательского центра "Стратегия" профессор **Леонид Заико** также считает, что Маринич мог стать лидером экономической элиты. По словам Заико, Мариничу удалось обзавестись связями с влиятельными российскими бизнесменами.

*"Маринич, видимо, напугал многих тем, что мог стать лидером экономической элиты и тем самым быть опасным для нашей местной номенклатуры",* — заявил Леонид Федорович в одном из своих интервью.

29 апреля адвокат попросила приобщить к уголовному делу медицинскую карту Михаила Маринича.

Старший сын Михаила Афанасьевича Игорь говорит, что его отец больше 20 лет страдал каменно-почечной коликой.

*"Все это время он каждый день делал специальную полуторачасовую гимнастику,* — говорит он. — *А незадолго до задержания он проходил обследование у кардиолога. Выяснилось, что у него больное сердце. Врачи рекомендовали ему срочную госпитализацию, однако отец отказался ложиться в больницу, сославшись на большую занятость".*

4 мая у Михаила Маринича появился второй адвокат — **Вера Стремковская.**

**Марина КОКТЫШ.**

Народная Воля 5 МАЯ 2004 г.

БЛІЦ-КАМЕНТАРЫЙ

# На склад!

Запасы гатовай прадукцыі прамысловасці прадпрыемстваў на 1 красавіка гэтага года склалі 1556 мільярдаў беларускіх рублёў, або 55,7 працэнта ад сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці. За першы квартал яны павялічыліся (у так званых супастаўімых цэнах) на 25,5 працэнта.

У агульным аб'ёме запасаў найбольш прадукцыі прадпрыемстваў машынабудавання і металаапрацоўкі, лёгкай, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці.

Вялікія запасы прадукцыі на складах — трывожны званок. Ён сведчыць, што вырабы нашых прадпрыемстваў не знаходзяць спажыўцоў і мёртвым грузам асядаюць на месцы іх вырабу. На іх выпуск затрачаны вялікія выдаткі, а выручкі ад рэалізацыі няма. Прадпрыемствы не маюць дастатковых сродкаў на абнаўленне вытворчасці і паляпшэнне якасці прадукцыі, павышэння заробкаў працаўнікам. У выніку будзе выраблядца яшчэ горшая прадукцыя, якая яшчэ больш будзе залежвацца на складах.

Праблема гэта не новая. Але вынікі першага квартала сведчаць аб тым, што яна не вырашаецца, нягледзячы на бравурныя заявы аб добрым пачатку сёлетняга года.

**Яўген ТАЎГЕНЬ.**

# Чарга за ліцэнзіяй

Апошнім часам ля чыноўніцкіх кабінетаў выцягваліся доўгія чэргі за ліцэнзіяй. Шматлікія прадпрымальнікі замест працы вымушаны прастойваць. Кампанія па пераліцэнзаванні праводзілася ў адпаведнасці з Дэкрэтам Аляксандра Лукашэнкі №17 "Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці" ад 14 ліпеня 2003 года. Ён быў пададзены тады як лібералізацыйнае дасягненне ў галіне ліцэнзавання. Асноўнай вартасцю дакумента чыноўнікі называлі рэзкае скарачэнне пераліку ліцэнзаваных відаў дзейнасці. І гэта сапраўды было так. Аднак, як лічыць незалежны эксперт, старшыня выканкама Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Альтэрнатыва — XXI" Сяргей Балыкін, недахопаў у гэтым дакуменце аказалася больш, чым вартасцяў. Такую думку ен выказаў у інтэрв'ю карэспандэнту агенцтва БелаПАН.

Найперш ен адзначыў наступнае: *"Дэкрэт патрабаваў замены ліцэнзій да 1 мая 2004 года і, нягледзячы на скарачэнне пераліку ліцэнзаваных відаў дзейнасці, у шмат разоў павялічыў колькасць суб'ектаў гаспадарання, чыя дзейнасць ліцэнзуецца. Пад ліцэнзаванне трапіла дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў, якія гандлююць на рынках. Раней яны ажыццяўлялі сваю дзейнасць без усялякіх ліцэнзій. Колькасць такіх індывідуальных прадпрымальнікаў у краіне — каля ста тысяч і таму маштаб працы па іх ліцэнзаванні вялікі. А тэрміны правядзення гэтай працы былі ўстаноўлены сціслыя — з 1 лістапада 2003 года па 1 мая 2004 года. Гэта выклікала вялізную нагрузку на ліцэнзуючыя органы і, адпаведна, — чэргі",* — сказаў Сяргей Балыкін.

Яшчэ адным недахопам ён назваў рэзкае павелічэнне кошту ліцэнзіі для індывідуальных прадпрымальнікаў. Калі раней індывідуальны прадпрымальнік за сваю ліцэнзію плаціў дзве базавыя велічыні, то на сённяшні дзень яна каштуе, як і для юрыдычнай асобы — 100 еўра.

Улады, відаць, пачулі абурэнні людзей. Прэс-служба Аляксандра Лукашэнкі паведамляе пра Дэкрэт №2 "Аб унясенні дапаўненняў і змен у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. №17", падпісаны 3 мая. Ім тэрмін пераафармлення раней атрыманых ліцэнзій падоўжаны да 1 студзеня. У тым ліку подоўжаны тэрмін атрымання ліцэнзій індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія гандлююць на рынках.

Тэрмін падоўжаны, але плата за ліцэнзію засталася не малой. Ды і пастаяць за ёй усё роўна прыйдзецца. Ды ці хутка не прыдумаюць якую-небудзь іншую перарэгістрацыю?

**Сяргей ІВАНОЎ.**

ПУЛЬС

## Тарыфы на камунальныя паслугі зноў змяніліся

*Урад Беларусі ўстанавіў новыя тарыфы на камунальныя паслугі, што аказваюцца насельніцтву, і плату за тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў. Пастанова ўступіла ў сілу 16 красавіка.*

У адпаведнасці з дакументам, плата за тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў устанаўліваецца 125,8 рубля ў месяц за адзін квадратны метр агульнай плошчы. Тарыфы на камунальныя паслугі зацверджаны ў наступных памерах: халоднае водазабеспячэнне — 135,5 рубля за адзін кубаметр, каналізацыя — 106,3 рубля за адзін кубаметр, цеплавая энергія для патрэбаў ацяплення і гарачага водазабеспячэння — 29.029,9 рубля за адну гігакалорыю, карыстанне ліфтамі — 1.015 рублёў з аднаго жыльца ў месяц, вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адыходаў — 3.435 рублёў за адзін кубаметр.

Як зазначаецца ў пастанове, павышэнне тарыфаў звязана з неабходнасцю выканання ўстаноўленага параметру па ўзроўні кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг, якія павінен складаць не менш за 60 працэнтаў да канца года.

Апошні раз кошт тэхнічнага абслугоўвання дамоў і тарыфы на камунальныя паслугі павышаліся ў сакавіку.

Урад таксама абавязаў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам забяспечыць сёлета зніжэнне затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву не менш чым на 20 працэнтаў без пагаршэння якасці паслуг, а таксама пашырыць наменклатуру і павялічыць аб'ёмы паслуг па рамонце і ўтрыманні жылых дамоў, што аказваюцца насельніцтву на платнай аснове.

**Лавінія АРЭШКА.**

## Для дэпутатаў законы не пісаны

Дэпутаты Віцебскага абласнога Савета дружна выступілі супраць спробы пракуратуры навесці законны парадак у мясцовай нарматворчасці, якая нярэдка выходзіць за межы здаровага сэнсу і парушае правы грамадзян.

Так, Гарадоцкі раённы Савет даў санкцыю на ўвядзенне мясцовага збору за права ажыццяўлення міжнародных перавозак. Пракурор Гарадоцкага раёна палічыў гэтую норму незаконнай і апратэставаў яе. Падтрымліваючы свайго правінцыйнага калегу, намеснік пракурора вобласці Ігар Багачоў выступіў на апошняй сесіі абласнога Савета і прапанаваў прысутным прагаласаваць за адмену рашэння гарадоцкіх дэпутатаў, якія парушылі адразу некалькі законаў і дапусцілі двайное падаткаабкладанне за права, што павінна прадастаўляцца не мясцовым, а рэспубліканскім органам улады.

"Сесія Гарадоцкага райсавета перавысіла свае паўнамоцтвы", — аўтарытэтна заявіў І.Багачоў, але ягоныя словы не пераканалі прысутных, бо яны, відаць, убачылі ў пазіцыі пракуратуры пагрозу і для сябе.

Супраць прапановы І.Багачова выступілі не толькі старшыня абласнога Савета Аляксандр Ацясаў разам з галоўным юрыстам Савета Валянцінай Рымковай, але і дэпутат ад Гарадоцкай акругі, намеснік старшыні аблвыканкама Віктар Пятруша.

Такім чынам, абласная ўлада "блаславіла" правінцыйных нарматворцаў на прыняцце любых дадатковых збораў і падаткаў, якія прыйдуць у галаву "слугам народным". Улада запэўніла мясцовых калег, што дзеля папаўнення казны прыдатныя ўсе сродкі. Нават супрацьзаконныя...

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

## Ідзе «разбор палётаў»

*У Гомельскім аддзеле ўнутраных спраў на транспарце высвятляюцца акалічнасці і прычыны самагубства адной са службовых асоб каравула Службы авіяцыйнай бяспекі (САБ) аэрапорта "Гомель-Авія".*

Як паведамілі БелаПАН ва Упраўленні ўнутраных войск на транспарце МУС Беларусі, ноччу 1 мая ў Гомельскі АУСТ паступіла паведамленне ад начальніка змены САБ мясцовага аэрапорта аб тым, што ў каравульным памяшканні службы быў знойдзены труп намесніка начальніка каравула САБ, 57-гадовага жыхара Гомеля. Мужчына скончыў жыццё самагубствам, выстраліўшы сабе ў галаву з замацаванага за ім табельнага пісталета ПМ.

На месца здарэння выязджала следча-аператыўная група Гомельскага АУСТ.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ.**

## За Анатолем Лябедзькам ізноў «палююць»

*3 мая старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька дапытаны ў Савецкім РУУС Мінска.*

У інтэрв'ю БелаПАН палітык паведаміў, што ён быў выкліканы ў РУУС па позве яшчэ на мінулым тыдні для допыту "ў якасці праваправаруша́льніка". Падставай для выкліку паслужыў нібыта ўдзел Анатоля Лябедзькі 26 красавіка ў арганізаваным апазіцыяй шэсці "Чарнобыльскі Шлях".

"Мне паказалі два рапарты, дзе была напісана нейкая адсябяціна пра тое, што я ледзьве ці не ўзначальваў шэсце 26 красавіка і выкрыкваў лозунгі: "Жыве Беларусь!" і іншыя. Да рапартаў прыкладаліся фатаграфіі, дзе я знаходжуся на плошчы Якуба Коласа. Я прапанаваў следчаму паказаць мне відэазапіс удзелу ў шэсці. Мы два разы глядзелі аператыўны відэазапіс, і мой удзел у шэсці не пацвердзіўся", — сказаў Анатоль Лябедзька.

Пасля гэтага допыт закончыўся, і палітык быў адпушчаны. Аднак, паводле слоў лідэра АГП, "так проста ўсё не закончылася". Праз паўтары гадзіны яму зноў патэлефанавалі з Савецкага РУУС і прапанавалі яшчэ раз прыйсці на допыт. На што Лябедзька адказаў, што зробіць гэта толькі па позве. Позву яму паабяцалі прыслаць на працягу найбліжэйшых дзён.

**Юрый ПАЦЁМКІН.**

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

# Ідэалагічны меч над беларускай навукай?

Пра тое, якое ідэалагічна-палітычнае шальмаванне зведала пасля абароны доктарская дысертацыя Алеся Пашкевіча "Канцэпцыя нацыянальнага быцця ў прозе беларускага замежжа XX стагоддзя", пісалі амаль усе недзяржаўныя газеты. І вось у сераду, 28 красавіка, справа прыйшла да чаканага фіналу: прэзідыум Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) Беларусі (кожны з членаў якога прызначаны кіраўніком дзяржавы) адмовіўся надаць званне доктара філалагічных навук маладому дысертанту.

Нагадаем, што публічная абарона згаданай дысертацыі адбылася яшчэ 15 лістапада 2002 года на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Усе атрыманыя водзывы на аўтарэферат працы і водзывы афіцыйных апанентаў на тэкст дысертацыі былі станоўчымі. Першым афіцыйным апанентам на абароне быў дырэктар інстытута літаратуры імя Я.Купалы акадэмік Уладзімір Гніламёдаў, афіцыйнай апаніруючай арганізацыяй — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны. На абароне прысутнічалі экс-старшыня ВАКа Беларусі і намеснік старшыні ВАКа Расіі. Цікавасць да абароны ўзмацнялася яшчэ і тым, што аўтар навуковай працы — нядаўна выбраны старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Як сведчаць пратаколы і прысутныя, абарона прайшла выдатна. За наданне А.Пашкевічу навуковай ступені доктара філалагічных навук выказаліся 13 членаў Савета па абароне (толькі адзін устрымаўся).

А потым навуковая справа пачала перарастаць у фарс. ВАК двойчы ўстрымліваўся ад зацвярджэння рашэння Савета па абароне, дысертацыя пасылалася на "чорныя" водзывы. Але і яны прыйшлі станоўчымі. Тады ВАКам дысертанту было прапанавана забраць сваю працу, "падправіць" некаторыя палажэнні і пераабараніць. На што А. Пашкевіч не пагадзіўся. Ды і як пагадзіцца з "няправільнасцю" сваіх высноў, калі літаратуразнаўцы Беларусі сведчылі пра яе высокі навуковы ўзровень і прафесійнасць.

Давялося ўспомніць змрочныя мінулыя гады. З'явіўся ліст за подпісам пяцярых ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (генералаў, палкоўнікаў) на імя прэзідэнта, у якім падрабязна разглядалася праца А. Пашкевіча, у якім быццам наводзіўся паклёп на філалагічную і гістарычную навуку БДУ і Нацыянальнай акадэміі навук ды ішло наступнае патрабаванне: *"Уважаемый товарищ Президент! Диссертацию Пашкевича А. А. мы рассматриваем как стремление белорусских оппозиционеров от науки оказать давление на власть с целью вынудить ВАК Белоруссии* (для аўтараў краіны Беларусь не існуе. — **Рэд.**) *признать научной, а значит, и правильной антигосударственную, антипатриотическую, национал-предательскую идеологию фашистских холуев — писателей и поэтов зарубежья. Мы просим вас защитить идеологию современного белорусского государства, защитить белорусскую науку от перевертышей, карьеристов и политических проходимцев".*

Аўтары згаданага ліста (можна з упэўненасцю гаварыць пра яго сфабрыкаванасць — прозвішчы падпісантаў пад камп'ютэрным тэкстам аддрукаваны праз капірку на механічнай машынцы) абвінавачваюць А. Пашкевіча ў даследаванні творчасці беларускіх пісьменнікаў, якія эмігрыравалі ў XX стагоддзі за межы Беларусі. Пяць ветэранаў перакананы, што гэта *"идеологическая акция, маскируемая под науку ... возглавляется скрытыми представителями националистической оппозиции, окопавшейся в БГУ, НАН Беларуси, других учебных и научных учреждениях".* У лісце ў *"подрывной антигосударственной"* рабоце абвінавачваюцца і навуковы кансультант А.Пашкевіча член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар Алег Лойка (названы гітлераўцам), і афіцыйныя апаненты, і нават былы міністр П.І.Брыгадзін, які да дысертацыі не меў аніякага дачынення.

Алесь Пашкевіч: і стала ўжо не да смеху...

Пасля гэтага ВАКам была створана спецыяльная камісія па разглядзе доктарскай дысертацыі А.Пашкевіча. У яе склад увайшлі члены экспертнага савета ВАКа па гісторыі. Вось гісторыкі — у адрозненне ад літаратуразнаўцаў — і адшукалі хібы...

*"Напачатку па пошце я атрымаў экспертнае заключэнне гісторыка (прозвішча, "па пратаколе", не падавалася,* — расказаў А.Пашкевіч. — *І падумаў, што гэта хтосьці няўдала пажартаваў. Аднак затым патэлефанавалі з ВАКа і перапыталі, ці атрымаў я той ліст. і стала ўжо не да смеху... Ананімны эксперт — не літаратуразнаўца! — запэўніваў, што мае "многія палажэнні ... не знайшлі навуковага абгрунтавання" і "засталіся своеасаблівымі ідэалагічнымі міфамі, прапагандысцкімі штампамі, мітынговымі лозунгамі", што "на многіх старонках дысертацыі няма ніякага навуковага літаратуразнаўства, а ёсць суцэльная палітызацыя літаратурнага працэсу". Ананімны эксперт пераконваў: "Аўтар не разумее ці не хоча разумець, што ... была самаахвярная праца па ператварэнні БССР у індустрыяльную рэспубліку з высокім навукова-тэхнічным і інтэлектуальным патэнцыялам". Ну можа яно і так, але ж я не пра індустрыялізацыю БССР пісаў... Пісаў пра літаратараў, пачынаючы ад Вацлава Ластоўскага, класіка нацыянальнай літаратуры, які вярнуўся з эміграцыі ды быў беспадстаўна арыштаваны і расстраляны ў БССР!*

*Здзіўляла непрафесійнасць майго эксперта, заключэнне якога было напісана з многімі арфаграфічнымі памылкамі (некалі ўсё апублікуецца), які нават не ведаў, што такое "жанры літаратурнай творчасці", хоць і пісаў пра тое. Паважаны гісторык знайшоў і "недапушчальныя памылкі фактаграфічнага характару". Сярод іх тое, што паўстанне 1863 года я назваў польска-беларускім, а не польскім, бо, як пісаў эксперт, "большасць беларускага народа не падтрымала шляхту, не ўдзельнічала ў паўстанні". Вось такія аргументы.*

*Але найбольш здзівілі мяне дзве наступныя думкі эксперта. Аб тым, што пісьменнікаў-эмігрантаў "ніхто з Бацькаўшчыны не выганяў, і ў межах Савецкай Беларусі яны маглі спакойна вырашаць і грамадскія і мастацка-творчыя задачы". Толькі як — не ўдакладнялася. У сталінскіх лагерах — як Масей Сяднёў, Пётра Сыч ды іншыя? Ці як ужо згаданы В.Ластоўскі — на тым свеце? Ці вось такая выснова паважанага гісторыка... Працытую: "Дысертацыя А.А. Пашкевіча напісана не на сучаснай беларускай літаратурнай мове, а на мове канца XIX — пачатку XX ст.". І ў пацвярджэнне на паўстаронкі прыводзіліся словы з працы: абсягі, паязджанства, ачольваў, ваяр, спакваля, унёсак... Па-першае, гэты закід я ўспрыняў як пахвальбу: мова канца XIX — пачатку XX ст. — гэта ж мова Купалы і Коласа! Па-другое, згаданыя "кепскія" словы значацца ў "Тлумачальным слоўніку" 1977 года пад рэдакцыяй К. Крапівы. Але, ізноў жа, стала не да жартаў, калі старшыня адмыслова створанага экспертнага савета ВАКа шчыра прызнаўся і далучыў свой абураны голас да голасу эксперта-гісторыка: "Я з цэнтральнага рэгіёна Беларусі, з Навагрудчыны, а таксама не разумею слова "абсяг"...".*

Спецыялізаваны ж экспертны савет ВАКа па літаратуразнаўстве пасля абароны доктарскай А.Пашкевіча двойчы разглядаў працу і двойчы яе ўхваляў. Згаданы ж "спецыяльна створаны" экспертны савет, у які ўвайшлі гісторыкі, сабраўся 20 красавіка і... падтрымаў высновы эксперта-гісторыка. На ім было прынята і "Заключэнне", асобныя палажэнні якога працытуем: *"Диссертация посвящена противоречивой в идейно-художественном и философско-политологическом контексте теме белорусского литературоведения... что фактически привело автора к признанию права на существование фашистской идеологии. ... В то время западная наука не скатывалась до подобных утверждений о социолизме и советском строе... Поэтому и концепция национального бытия, идеологический базис которой составляют злобные политические инсинуации, неизбежно превращается в наукообразный элемент деструктивной антинациональной пропаганды".*

На "шапцы" працытаванага дакумента, праўда, пазначалася ўжо, што гэта заключэнне "комиссии". *"Добра, што не "асобай тройкі",* — горка пажартаваў А.Пашкевіч. — *У таго, хто не знаёмы з маёй дысертацыяй, пасля прачытання такога заключэння можа скласціся ўражанне, што я ці вораг, ці вар'ят! А я ўсяго толькі паспрабаваў прааналізаваць творчасць беларускіх празаікаў замежжа ў абсягу XX стагоддзя і зрабіць выснову: якім жа ім там, без сталінска-савецкай цэнзуры, бачылася нацыянальнае быццё... і, што найбольш паказальнае, іх бачанне ў агульных пастулатах не супярэчыць сённяшняму дзяржаўнаму: незалежнасць і самастойнасць Беларусі, велічнае мінулае Бацькаўшчыны, выкрыццё сталінскіх рэпрэсій дзеля духоўнага і грамадзянскага ачышчэння, усведамленне роднай мовы як найбольшай культурнай каштоўнасці нацыі. З апошнім, праўда, у нас нескладна..."*

Неабгрунтаванымі бачацца і абвінавачванні А.Пашкевіча ў прыніжэнні ролі савецкай літаратуры, што нібыта прасочваецца ў яго дысертацыі. Падтрымліваючы свайго калегу і беларускія літаратары, члены Саюза беларускіх пісьменнікаў, сярод якіх большасць мелі адносны з савецкім мастацкім працэсам, сярод якіх — і каля сарака ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

На пытанне аб тым, што ён збіраецца рабіць далей — пасля ВАКаўскага судзілішча, А.Пашкевіч адказаў наступнае: *"Буду старацца радавацца жыццю. І па меры маіх сіл шукаць праўду. Маё навуковае сумленне — чыстае. ВАКаўскія абвінавачанні — бяздоказныя. Хачу яшчэ раз падкрэсліць: на Беларусі і па-за яе межамі не знайшлося ніводнага навукоўца, даследчыка беларускай літаратуры, хто б выказаўся пра маю дысертацыю адмоўна. І гэта дазваляе быць аптымістам. А яшчэ, думаецца, я стаў сведкам эксперыменту на высокім узроўні. Яшчэ ў верасні 2002 года, за дзень да з'езда Саюза пісьменнікаў, тагачасны памочнік прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і начальнік Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення І.А.Карэнда пры размове са мной у кабінеце Адміністрацыі запатрабаваў, каб я зняў сваю кандыдатуру пры выбарах старшыні Саюза пісьменнікаў. Распытаў і пра маю доктарскую, запісаў яе тэму ў свой блакнот і недвухсэнсоўна дадаў: "Вы ж разумны чалавек. Вам яшчэ ж доктарскую абараняць..." Доктарскую я абараніў, але запіс той, напэўна ж, застаўся.. Дык вось, наконт эксперыменту... Я яшчэ раз пераканаўся, што супраць лому — няма прыёму".*

У падтрымку аднаго са сваіх вучняў адзін з найбольш даследчаных даследчыкаў беларускай прозы прафесар **Дзмітрый Бугаёў** у інтэрв'ю БелаПАНу назваў А.Пашкевіча *"вельмі падрыхтаваным чалавекам"*, дысертацыя якога выканана *"на самым высокім навуковым узроўні... Гэта выдатная праца, адна з самых арыгінальных і сучасных. Па сутнасці ён адкрыў нам цэлы мацярык беларускай прозы, да гэтага часу не даследаваны".* На думку прафесара Бугаёва, у лісце, пасля якога і пачалося цкаванне і шальмаванне маладога навукоўца, яскрава выяўляецца *"рэтраградная пазіцыя. Час ідзе, і ніхто з іх спыніць яго не можа, бо камунізм атрымаў паражэнне ў сусветным маштабе... Абсалютна зразумела, што дысертацыя не зацверджана па чыста палітычных і ідэалагічных матывах — гэта бясспрэчны факт".*

Факт — фактам, але... Але ці не становімся мы сведкамі ідэалагічнай і палітычнай цэнзуры ў беларускай навуцы? Ці не адрадзілася ў нашай краіне атмасфера мінулага дыктату? Якраз гэтую думку ў гаворцы БелаПАНу наконт доктарскай дысертацыі А.Пашкевіча і агучыў вядомы культуролаг **Вацлаў Арэшка:** *"Самае страшнае, калі ў грамадскай свядомасці адраджаюцца формы літаратурнага, калектыўнага, навуковага даносу, чаго ў цывілізаваным грамадстве няма".*

**Анатоль ГУРСКІ.**

## Беларускія рэжысёры на «сяброўскай назе» з «Законам і грамадствам»

*Рэжысёр студыі "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Анастасія Суханава атрымала спецыяльны прыз за серыю сацыяльных ролікаў "Права на надзею" на міжнародным фестывалі дэтэктыўных фільмаў і тэлепраграм праваахоўнай тэматыкі "Закон і грамадства" ў Маскве.*

Спецыяльны прыз у намінацыі "Злачынства і пакаранне" за адлюстраванне крымінальна-выканаўчай сістэмы ў выяўленні і пакаранні атрымаў беларускі рэжысёр Аляксей Туровіч за ігравую карціну "Турма для кума", якая стала яго рэжысёрскім дэбютам. Дзеянне фільма адбываецца ў папраўчай калоніі. Стваральнікі кінастужкі здолелі паказаць, што "зона" жыве не толькі па сваіх законах, але і па чалавечых прынцыпах.

## «Мы жывём на краі...» І гэта ацанілі

*Беларускі рэжысёр Віктар Аслюк атрымаў залаты медаль за найлепшы замежны дакументальны фільм на фестывалі дакументальных і кароткаметражных фільмаў у Бялградзе за карціну "Мы жывём на краі...".*

Як паведаміла БелаПАН галоўны рэдактар студыі дакументальных фільмаў "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Наталля Сцяжко, на кінафоруме, які прайшоў у красавіку, рэжысёру таксама ўручылі дыплом ад Федэрацыі югаслаўскай прэсы і крытыкі.

Новая карціна Віктара Аслюка "Шахта", якая распавядае пра будні салігорскіх шахцёраў, адабрана на 8-ы форум "Новае кіно краін СНД і Балтыі", які пройдзе ў Маскве з 24 па 30 мая. У гэты ж час яго карціна будзе паказана на форуме ў Барселоне.

**Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.**

## Музычная класіка не старэе

Не ў снежні, як звычайна, а значна раней - напрыканцы красавіка — адбыўся ў Віцебску чарговы XVI міжнародны музычны фестываль імя Івана Салярцінскага, знакамітага музыказнаўца, заснавальніка дзвюх буйных расійскіх філармоній, які ў свой час плённа працаваў у галіне прапаганды сусветнага музычнага мастацтва, выступаючы з адмысловымі лекцыямі аб зорках сусветнай класічнай спадчыны і адначасова адкрываў новыя таленты ў сваёй краіне. Самыя плённыя гады працы І.Салярцінскага прайшлі ў Ленінградзе. Нездарма амаль у кожным з канцэртаў фестываля, які праходзіў у віцебскім музычным вучылішчы, што носіць імя выдатнага земляка і побач з якім летась быў адкрыты помнік славутаму культуролагу і мастацтвазнаўцу, выступалі прадстаўнікі Санкт-Пецярбурга, дзе ў роскве сіл і таленту працаваў Іван Іванавіч Салярцінскі.

Віцебскія меламаны атрымалі асалоду ад майстэрства маладых салістаў Марыінскага тэатра, кампазітара Аляксандра Смялкова і маладзёжнага камернага аркестра "Балтыка", удзельнікі якога з'яўляюцца лаўрэатамі і прэстыжных міжнародных конкурсаў.

Жыхары горада на Заходняй Дзвіне пачулі маскоўскага скрыпача-віртуоза Дзмітрыя Когана, які лічыцца адным з лепшых інтэрпрэтатараў Паганіні.

Захапленне слухачоў выклікала салістка Маскоўскай філармоніі, лаўрэат міжнароднага конкурсу піяністаў імя Ф.Шапэна Ірына Чукоўская.

Беларусь на фестывалі традыцыйна (і, як заўжды, з поспехам) прадставіў ансамбль салістаў "Класік-авангард".

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

# Нараджэнне дуэта

Імёны маладых спявачак **Вольгі Сотнікавай** і **Святланы Старадзеткі** добра вядомы аматарам акадэмічных спеваў. Амаль аднычасова яны пачалі працаваць у канцэртна-лекцыйным бюро Беларускай дзяржаўнай філармоніі і за некалькі сезонаў здолелі ажыццявіць шмат цікавых творчых праектаў, — праўда, кожная паасобку. Але зусім нядаўна Вольга і Святлана нечакана вызначылі, што іх галасы вельмі добра спалучаюцца ў дуэтных спевах. Тыя, хто чуў іх невялікія сумесныя выступленні ў канцэртах **"Музычнай гасцінай"**, адразу ж адзначылі, што палётнае меца-сапрана Вольгі Сотнікавай і аксамітнае сапрана Святланы Старадзеткі на самай справе ствараюць чароўны вакальны ансамбль. У працяг гэтага цікавага творчага эксперыменту дзяўчаты вырашылі падрыхтаваць самастойную дуэтную праграму з рамансаў рускіх і замежных кампазітараў. Прэм'ера гэтай праграмы сапраўды азнамяну́е нараджэнне іх дуэта. Сумесны канцэрт Вольгі Сотнікавай і Святланы Старадзеткі адбудзецца 10 мая ў зале камернай музыкі, што ў касцёле Святога Роха. У іх вечарыне прыме ўдзел інструментальнае трыо ў складзе **Кацярыны Архіпавай** (скрыпка), **Наталлі Малышавай** (віяланчэль) і **Алены Лузан** (фартэпіяна), у суправаджэнні якіх прагучаць рамансы М.Глінкі, А.Варламава, А.Грачанінава, Р.Шумана і іншых кампазітараў.

**Ул.інф.**

**На здымку:** *Вольга Сотнікава і Святлана Старадзетка.*

SOS!

# Это может случиться с каждым

Новополоцко-Полоцкая региональная организация Свободного профсоюза Белорусского (СПБ) начала сбор средств для активистов СПБ, которые уволены с работы, и призывает всех помочь в этом деле. Напомним, что уже уволены председатели первичных организаций СПБ Полоцкой ТЭЦ Олег Щайтор и ОАО "Полоцк-Стекловолокно" Виктор Стуков. Уведомления о прекращении контрактов получили работники Новополоцкой ТЭЦ Вадим Духоменко, Юрий Гайченко и Юрий Обухов, которые в ближайшие дни могут также оказаться безработными.

"Увольнение этих работников — это не простое "прекращение контрактов", — считает председатель Новополоцко-Полоцкой региональной организации СПБ Владимир АНТОНОВИЧ. — Это удар по пяти семьям, кормильцы в которых становятся безработными. Заметьте: за проходной оказываются не прогульщики, не пьяницы и не нарушители трудовой дисциплины, а хорошие специалисты, отзывчивые товарищи, достойные граждане своей страны. Их хотят уволить только за то, что они не побоялись открыто отстаивать права — свои и своих коллег. Являясь членами СПБ, они хотят, чтобы рабочие получали достойную зарплату и трудились в нормальных условиях. Именно за это с ними расправляются...".

По словам Владимира Антоновича, самое ужасное в данной ситуации — это то, что подобное может случиться с каждым. Ведь процесс контрактизации набирает стремительные обороты. На контракты переводят рабочих крупнейших предприятий страны, служащих, бюджетников. "Переводят без их согласия, пользуясь тем, что люди плохо знают свои права, — считает лидер новополоцких "свободных". — Таким образом власти пытаются запугать трудовой народ: сиди на контракте и помалкивай, а не то через год окажешься на улице. И не сомневайтесь — там обязательно окажутся многие из нас! Если только не объединимся сейчас и не проявим рабочую солидарность. Если сегодня мы все вместе не защитим людей, которых ни за что выгоняют с работы, — завтра никто не защитит нас! Если каждый из нас сейчас не скажет свое слово в поддержку этих рабочих — потом и его увольнение по истечении срока контракта встретит безразличная тишина!"

Помогать остающимся без работы товарищам Свободный профсоюз решил не только словом и делом, но и рублем. На расчетный счет региональной организации СПБ начинают поступать средства в фонд поддержки уволенных профсоюзных активистов. Свободный профсоюз просит всех, кто имеет такую возможность, помочь людям, пострадавшим за свои идеи. **Средства собираются на р/с 3015008980017, филиал №214 АСБ "Беларусбанк" г. Новополоцка, код 660, УНН 300720175, Новополоцко-Полоцкая РО СПБ, с пометкой "В фонд активистов".**

**praca-by.info**

ОТКРОВЕННО

# При жизни дружили, после смерти забыли...

В негосударственной прессе прошли публикации в связи с очередной годовщиной смерти Геннадия Карпенко. Кое-что мне хотелось бы добавить. У Геннадия Дмитриевича было много друзей — и в оппозиции, и во властных структурах. От последних он нередко получал ценную информацию, которая помогала Карпенко просчитать действия своих политических оппонентов, выбрать адекватный для данной ситуации ответ. Однако по истечении времени можно утверждать: так называемые друзья из власти оказались друзьями липовыми. Похоже, что все их действия в ту пору диктовались чисто конъюнктурными соображениями — кто знает, вдруг власть переменится, Карпенко окажется на ее вершине? А потому на всякий случай не нужно разрывать связь с опальным политиком. Авось потом это зачтется.

Неискренность этих людей стала особо заметна после того, как Геннадий Дмитриевич ушел из жизни. С тех пор отношения к его семье резко изменились — сошли на нет телефонные звонки, никто не предлагал помощи, не высказывал даже простого человеческого сочувствия.

Вот несколько ярких примеров. Именно Геннадий Карпенко пытался преобразовать город Молодечно. Кто-то иронично подшучивал: мол, что это за "город солнца"... Но если уровня мечтателей Молодечно и не достиг (по моему мнению, просто времени не хватило), все же город этот при Геннадии Дмитриевиче Карпенко заметно выделялся на фоне подобных городов Беларуси. Достаточно сказать, что здесь, а не в Минске регистрировались крупные фирмы. Они чувствовали себя здесь комфортнее и уютнее, а город от этого только выигрывал — его бюджет пополнялся за счет различных отчислений. Стал Молодечно и городом культуры. С подачи Геннадия Карпенко начал проводиться ежегодный фестиваль белорусской поэзии и песни. И как же быстро надо позабыть бывшего руководителя города и организатора фестиваля, чтобы о нем даже не вспомнить. Александр Добровольский — соратник Геннадия Карпенко по объединенной Гражданской партии, по Верховному совету 13-го созыва — говорит: *"В прошлом году я был на Молодечненском фестивале, которому тогда исполнилось 10 лет. И никто из представителей власти даже не вспомнил о Геннадии Дмитриевиче Карпенко".*

Год назад, в канун четвертой годовщины со дня смерти Геннадия Карпенко, руководство Объединенной гражданской партии обратилось в Минский горисполком с просьбой присвоить одной из улиц белорусской столицы имя Геннадия Карпенко — члена-корреспондента Национальной академии наук, лауреата Государственной премии, Заслуженного деятеля науки Республики Беларусь, вице-спикера Верховного Совета страны 13-го созыва... Как рассказывает председатель ОГП Анатолий Лебедько, руководство города ограничилось отпиской: мол, нужны новые улицы, а когда они появятся в городе — неизвестно. И это при том, что в столице до сих пор сохраняются улицы Буденного, Мясникова, Урицкого и других людей, которые или не имеют абсолютно никакого отношения к истории, или своей деятельностью принесли Беларуси много несчастий. А о чем говорят такие названия улиц, как Коммунистическая, Красная, Советская и т.д.?

Геннадия Карпенко ценили и уважали не только его близкие партийные друзья. Профессор Юрий Ходыко, по его собственному признанию, не всегда разделял взгляды Геннадия Дмитриевича на понимание политики, на развитие событий. Однако это не помешало им оставаться друзьями. *"Смерть Геннадия — это, конечно, большая потеря для Беларуси. Каждый раз, когда я его вспоминаю, на память приходят его жизнелюбие, его оптимизм, которые соединялись в его характере с твердостью и последовательностью",* — говорит Юрий Ходыко.

**Владимир ГЛОД.**

# ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

## Ясира Арафата окружили

Израильские войска блокировали резиденцию лидера Палестинской автономии Ясира Арафата в Рамалле. По свидетельству очевидцев, несколько десятков военных внедорожников окружили территорию, а солдаты заняли здания в округе. Все три входа в здание перекрыты. Палестинская сторона опасается, что началась подготовка к физическому устранению Арафата. Однако представители израильских военных заявили, что проводят операцию по поимке разыскиваемых экстремистов и к Арафату она не имеет никакого отношения.

Тем не менее израильский премьер-министр Ариэль Шарон недавно заявил, что более не считает себя обязанным выполнять данное ранее обещание не причинять вреда палестинскому лидеру. Израильская сторона неоднократно подчеркивала, что Арафат, который не покидает резиденцию в Рамалле уже более двух лет, волен выехать оттуда, однако вернуться обратно ему едва ли позволят.

## Британцы принимают в ЕС несуществующее государство

Примерно каждый 10-й британец полагает, что 1 мая в Евросоюз вступит несуществующее государство — Лувания. Как сообщает французское информационное агентство France Presse, это выяснилось в ходе исследования, проведенного компанией One.Tel, провайдером британской Telephone Communications. Компания предложила участникам исследования список стран, которые должны в ближайшее время войти в ЕС. В список стран ради интриги One.Tel включила и Луванию. И почти 10 процентов из 2,5 тысячи опрошенных сочли эту страну действительно существующей и готовой к вступлению в Евросоюз. Что любопытно — среди людей старше 50 лет в Луванию и ее будущее в ЕС поверили еще больше народа — свыше 11 процентов опрошенных.

По словам представителя компании One.Tel, это показывает, что люди куда больше интересуются своими повседневными делами, чем происходящим в единой Европе. Этот вывод подтверждается тем фактом, что около 15 процентов опрошенных полагали, что Австрия только собирается войти в ЕС. Между тем эта страна стала членом Евросоюза еще в 1995 году.

## Пострадавших при взрыве в Северной Корее будут лечить американскими препаратами

Северная Корея согласилась принять от США помощь в виде медикаментов для пострадавших при взрыве на станции Йончхон 22 апреля, передает агентство France-Presse со ссылкой на американское посольство в Южной Корее. Как рассказала пресс-секретарь посольства, США планирует поставить в КНДР лекарства и внутривенные препараты для лечения около 20 тысяч человек. Срок годности медикаментов составляет три месяца. Пока не ясно, принял ли Пхеньян предложение об отправке в страну группы американских специалистов по экстремальной медицине. Также не известно, каким образом лекарства будут доставлены в КНДР.

Кроме того, правительство США пообещало выделить Международному Красному Кресту 100 тысяч долларов в помощь оставшимся без крова жителям прилегающего к месту катастрофы района. В результате взрыва на станции Йончхон погиб по крайней мере 161 человек и 1300 были ранены, разрушено около 8100 домов.

## Билла Гейтса оштрафовали на 800 тысяч долларов

Самого богатого человека в мире главу компании Microsoft Билла Гейтса оштрафовали на 800 тысяч долларов за сокрытие операции по приобретению акций. Сделка была осуществлена инвестиционной компанией Гейтса и не имеет отношения к деятельности Microsoft. Как сообщается, Гейтс приобрел акции фармацевтической компании Icos Corp на сумму более 50 миллионов долларов. Согласно законодательству США, о таких сделках необходимо сообщать властям. По некоторым данным, Гейтс полагал, что этот закон на него не распространяется, поскольку он приобретал акции с инвестиционными целями.

Состояние основателя и главы Microsoft оценивается более чем в 40 миллиардов долларов, напоминает BBC News.

## За свадьбой испанского принца будет следить самолет НАТО

Испания обратилась к руководству НАТО с просьбой предоставить разведывательный самолет системы AWACS для обеспечения безопасности во время свадебной церемонии наследного принца Фелипе. Свадьба принца и телеведущей Летисии Ортис должна состояться в мадридском соборе Альмудена 22 мая. Как ожидается, самолет НАТО будет патрулировать воздушное пространство над испанской столицей. Церемония пройдет при повышенных мерах безопасности. Так, воздушное пространство над Мадридом закроют, а действие Шенгенского соглашения для въезжающих в страну будет приостановлено. Порядок на улицах столицы будут обеспечивать около 10 тысяч полицейских.

Как полагает Reuters, такая предосторожность связана с терактами в Мадриде в марте, в результате которых погиб 191 человек. Пресс-служба Министерства обороны Испании пока никак не прокомментировала эту информацию. Самолеты AWACS оснащены радиоэлектронным оборудованием для слежения за обширным воздушным пространством. По некоторым данным, несколько самолетов НАТО системы AWACS будут обеспечивать безопасность с воздуха во время чемпионата мира по футболу в Португалии.

## Британская политика отмечает серебряный юбилей «железной леди»



Исполнилось 25 лет с того дня, как на выборах премьер-министра Британии победила Маргарет Тэтчер, первая в истории страны и пока единственная женщина-премьер. Ее победа возвестила о начале одного из наиболее знаменательных этапов в современной истории Британии. 11 лет правления Тэтчер были отмечены серьезными реформами в экономической, политической и даже в культурной сферах. И лишилась поста премьера "железная леди" не из-за поражения на выборах, а в результате раскола в Консервативной партии относительно отношений Британии с Европой.

Британское общество по-разному относится к роли, которую "железная леди" сыграла в его истории. В мае 1979, когда Маргарет Тэтчер пришла к власти, Британия была совсем другой: профсоюзы были серьезной политической силой, с мнением которой приходилось считаться, государство контролировало чуть ли не все сферы экономики — от выработки электроэнергии до производства автомобилей.

Тэтчер ослабила профсоюзы, провела широкомасштабную приватизацию и внушила рядовым гражданам мысль о том, что им нужно взять на себя большую ответственность за свою собственную жизнь. Многие из инициатив Тэтчер сталкивались с жестоким сопротивлением, однако то, что казалось новым, теперь стало основами британской политики.

И все-таки многие в Британии поминают Тэтчер недобрым словом, потому как "железной леди" не удалось до конца реализовать все свои замыслы. В частности, приватизация миновала национальную систему здравоохранения.

## В Германии открыт памятник жертвам авиакатастрофы над Боденским озером

На окраине немецкого города Юберлинген открылся памятник погибшим в катастрофе самолета Ту-154 компании "Башкирские авиалинии", который над Боденским озером столкнулся с грузовым "Боингом-757". Жертвами катастрофы стали 71 человек, в том числе 69 пассажиров и членов экипажа российского самолета. Большинство из погибших в результате столкновения российского лайнера с "Боингом" — уфимские дети, которые летели на отдых в Испанию. Проект памятника разработала художница из Юберлингена Андреа Цаумзаль. Монумент представляет собой разорванное ожерелье из жемчуга. По замыслу автора, эта композиция символизирует прерванную человеческую жизнь.

При этом жемчужины, выпавшие из ожерелья, ассоциируются с угрозой, которой удалось избежать жителям Юберлингена. Обломки упавшего Ту-154 упали в нескольких десятках метров от жилых домов. На памятнике по латыни написано "Помни о смерти".

## Бывшие советские военнопленные потребуют от ФРГ компенсаций за рабский труд

Несколько сот бывших советских военнопленных намерены подать коллективный иск в Высший административный суд ФРГ с требованием распространить на них компенсации, выплачиваемые за рабский труд другим бывшим узникам Третьего рейха. Как сообщил представляющий интересы военнопленных немецкий адвокат Стефан Ташьян, уже в мае он намерен подать в немецкий суд коллективный иск от лица нескольких сот бывших советских военнопленных, ныне проживающих в Армении. В конце апреля Ташьян завершил работу в московских архивах и теперь знакомится с делами своих клиентов в Ереване. Он уточнил, что иск будет адресован Минфину ФРГ и занимающемуся выплатами жертвам нацизма германскому фонду "Память, ответственность и будущее".

Летом прошлого года Ташьян уже представлял в берлинском суде интересы двух бывших советских военнопленных, пытавшихся добиться выплаты им компенсаций наравне с другими категориями узников Третьего рейха, напоминает агентство. Берлинский административный суд тогда отклонил иск, ссылаясь на местное законодательство, по которому пребывание в плену "не является основанием для получения компенсаций".

В Берлине полагают, что все вопросы по военнопленным урегулированы соглашениями о репарациях и Лондонским соглашением о долгах от 1953 года. Право на получение материального возмещения, по этим нормам, получают лишь те категории военнопленных, которые были переведены в статус гражданских узников еще самими нацистами. Ташьян сообщил, что в связи с этим группа итальянцев, подавшая иск одновременно с его клиентами, уже отсудила себе компенсации.

## За пост президента Литвы будут бороться 10 претендентов

Участвовать в досрочных президентских выборах в Литве изъявили желание 10 претендентов. Об этом сообщил председатель Главной избирательной комиссии (ГИК) Зенонас Вайгаускас по истечении срока подачи заявительных документов. По закону, кандидатами в президенты могут быть зарегистрированы те претенденты, которые до 8 мая внесут в ГИК не менее чем по 20 тысяч подписей в поддержку их кандидатур. Регистрация кандидатов в президенты закончится до 18 мая. Досрочные президентские выборы в Литве проводятся 13 июня в связи с тем, что бывший президент Паксас 6 апреля путем импичмента смещен со своего поста за грубое нарушение Конституции и присяги. Ранее Паксас был зарегистрирован кандидатом на пост президента.

СКРЫЖАЛІ

# Ці ёсць у сталіцы Беларусі душа?

Для горада цэнтр — гэта не геаграфічная кропка ці адміністрацыйнае вызначэнне. Гэта тое, што ў дачыненні да чалавека мы назвалі б душою — неакрэсленай, нематэрыяльнай субстанцыяй, у якой акумулююцца пачуцці, эмоцыі.

Праўда, душа горада мае не абстрактна-ўяўны, а візуальна-канкрэтны вобраз. Звычайна гэта Храм і Ратуша з прылеглай тэрыторыяй. Я б сказаў, гэта тая частка гарадской прасторы, дзе ў дні святаў ці агульнай бяды людзі збіраюцца без загаду, прымусу, без папярэдняй дамоўленасці. Нібыта ногі самі нясуць месцічаў туды, дзе не толькі муры і брукаванка, але, здаецца, нават паветра намоленае многімі пакаленнямі нашых продкаў, дзе не адчуваеш сябе самотным нават у натоўпе.

Гарадскі цэнтр — гэта месца, якое само па сабе з'яўляецца падзеяй. А яшчэ знакам гісторыі, увасабленнем памяці, здабыткам культуры. Выраз "стварэнне (праектаванне, будаўніцтва) новага цэнтра горада" патыхае абсурдам. Ён з таго ж шэрагу, што і "пабудова новага свету" і "стварэнне новага чалавека". Праходзілі... У старым горадзе не можа быць новага цэнтра. Ніякая фешэнебельная новабудоўля не здольная замяніць Вільне плошчу Гедыміна і замкавую вежу на гары, Варшаве — Старэ Място, Маскве — Чырвоную плошчу і Крэмль. Цэнтрам Парыжа заўжды будзе выспа Сітэ, а цэнтрам выспы пляц перад Нотр-Дам.

З ростам горада непазбежна ўзнікае сітуацыя, калі гістарычны цэнтр ужо не можа ўмясціць ўсе культавыя, культурніцкія, гандлёвыя і адміністрацыйныя ўстановы агульнагарадскога (у сталіцы — агульнадзяржаўнага) прызначэння. Такім чынам, частку сваіх другасных функцый цэнтр мусіць перадаць іншым раёнам. Але галоўнай — сакральнай, ён валодае непадзельна.

Ці мае такі цэнтр Мінск, ці ёсць у нашай сталіцы душа? Калі ёсць, дык дзе яе шукаць?

На пытанне, дзе ў Мінска цэнтр, зададзенае мінчуку, вы пачуеце не меней як тры розных адказы. Плошча Незалежнасці, Кастрычніцкая, плошча Перамогі. А хтосьці адкажа, што цэнтра ў звыклым разуменні горад не мае; альбо, што цэнтр — гэта праспект Скарыны на ўсім ягоным працягу. Кожны адказ будзе па-свойму правільным. Бо у Мінска і насамрэч цэнтр "блукаючы". На момант абвяшчэння горада сталіцаю БССР — гэта плошча Высокага рынку, яшчэ вядомая як Саборная, перайменаваная згодна з рэвалюцыйнай модай у плошчу Свабоды (пляц Волі, як казалі тады). У 30-я гады статус цэнтральнай плошчы афіцыйна замацоўваецца за плошчай Леніна (будучай плошчай Незалежнасці), дзе быў пабудаваны Дом урада і пастаўлены помнік бальшавіцкаму правадыру. Дом урада быў для тае пары не толькі галоўным адміністрацыйным будынкам Беларусі, але і сімвалам новага сацыяльнага ладу. Гэта свайго роду культавы аб'ект. Па аналогіі з храмам, сцены якога ўпрыгожваюць карціны з жыцця Ісуса, інтэр'еры рэзідэнцыі ўрада БССР і дагэтуль аздабляюць сюжэты кананізаванага аповеду пра "Сусветную рэвалюцыю".

У 50-я гады ў плошчы Леніна з'яўляецца ідэалагічны дублёр. Гэта Цэнтральная плошча (цяпер Кастрычніцкая). У афіцыйнай гарадской іерархіі яна тады заняла месца больш высокае, чым пляц з Домам урада. Бо плошчу Леніна пабудавалі ў гонар правадыра, што ляжаў у труне, а на Цэнтральнай паставілі помнік жывому Язэпу Вісарыёнавічу. (Адзначу, што звычайна прыжыццёвыя помнікі не перажываюць смерці свайго персанажа; і гэты помнік таксама знялі, калі Сталін памёр). Парады і дэманстрацыі, якія раней трымалі раўненне на бронзавага Ільіча, пераарыентавалі на новы ідал. На плошчы нават гранітную ўрадавую трыбуну збудавалі, каб з яе вышыні кіраўнікі маглі годна вітаць народ. Напрыканцы 80-х — пачатку 90-х плошча Леніна (пасля падзення СССР — плошча Незалежнасці) зноў стала галоўнейшай. Бо на Цэнтральнай разгарнулася будаўніцтва Палаца Рэспублікі, парады і дэманстрацыі зноў перанеслі пад Дом урада. Сюды прыходзіў і "несанкцыянаваны" народ з бел-чырвона-белымі сцягамі, каб псіхалагічна ціснуць на Вярхоўны Савет.

Улада, зразумела, абаранялася. Міліцэйскімі дубцамі і ўрадавымі пастановамі. За плошчаю Незалежнасці быў замацаваны асобны статус, згодна з якім на ёй забаранялася ладзіць масавыя акцыі. А комплексная рэканструкцыя плошчы, якая ідзе зараз, па завяршэнні зробіць такія акцыі немагчымымі фізічна. Плошчу забудуюць так, што на ёй не будзе прасторы, якая магла бы прыняць шматтысячны натоўп. Мяркуюць, што менавіта з такою мэтаю ў Маскве рэканструявалі Манежную плошчу. Крэмль, напалоханы выбухамі масавага непадпарадкавання ў 1991 і 1993 гадах, ухваліў забудову свабоднай прасторы побач з Краснай плошчай, каб патэнцыяльныя экстрэмісты не збіраліся ў стаю проста пад вокнамі прэзідэнта РФ. Такім чынам, наш праект — плагіят.

Палац Рэспублікі дабудавалі, рэальная ўлада перасунулася з Дома ўрада ў колішні Дом ЦК. Гранітная ўрадавая трыбуна зноў пры справе. Кастрычніцкая плошча зноў галоўная. А каб ніхто ў гэтым не сумняваўся, на ёй паставілі знак, які паведамляе, што адсюль пачынаюцца ўсе беларускія дарогі ў Маскву. Людзям, хворым на агарафобію (страх адкрытай прасторы), я не раіў бы без пільнае патрэбы шпацыраваць па Кастрычніцкай плошчы. Міністэрства аховы здароўя папярэджвае: можна звар'яцець. Сам бачыў, як мой знаёмец, жыхар Вільні, апынуўшыся на гэтай плошчы, схапіўся за сэрца са словамі: "Навошта будаваць такія вялікія гарады!"

У адрозненне ад Кастрычніцкай плошча Перамогі атрымалася і ўтульнай, і прэзентатыўнай. Нават велічнай. Мінчукі яе шануюць. Фамільярна клічуць "Кругляком", хоць яна ўжо даўно мае форму эліпса. Плошчу Незалежнасці, Кастрычніцкую, а разам з імі плошчы Коласа і Калініна проста прымаюць як факт, як дадзенасць, калі хочаце, як надвор'е. А вось гэтую лічаць сваёю, паважаюць за сапраўдны, не афіцыёзны сімвал горада. Прынамсі, на дадзены момант. Бо ў гэтым сэнсе канкурэнцыю ёй пачынае складаць часткова адбудаваны Верхні горад. На плошчы Перамогі няма ўрадавых будынкаў, для парадаў яна нязручная, афіцыйна галоўнай ніколі не лічылася, — у свядомасці паспалітага мінчука гэта станоўчыя якасці. Народ апрыёрна не любіць уладу, пратакольныя мерапрыемствы і афіцыйную іерархію. Мінчукам даспадобы тое, што побач рака і парк. Нацыянальнай ментальнасці пасуе эмацыянальны змест плошчы (веліч без гігантаманіі) і тая акалічнасць, што тэма вайны і перамогі адлюстравана ў манументе ў даволі карэктнай форме. Помнік не правакуе нянавісць і не заклікае да помсты. У гэтай сувязі прыгадаю, што старажытныя грэкі ўвогуле ставілі сваім ваенным перамогам помнікі з дрэва, каб праз пэўны час яны самаразбураліся і не маглі служыць вечным напамінам пра варожасць, не выклікалі ў пераможаных прагі рэваншу.

Мінск, як і належыць вялікаму гораду, сталіцы далёка не горшай у свеце краіны, мае драматычную гісторыю. Вядома: дзе шмат будуецца, там і руйнуецца нямала. Пакуль "новы" цэнтр "блукаў" па праспекце Сталіна — Леніна — Скарыны, побач з праспектам гібеў гістарычны цэнтр сталіцы — Верхні горад. "Блукаючы" цэнтр Мінска быў люстэркам няўцямнай "савецкай дзяржаўнасці" Беларускай ССР. Як перасоўвалі бальшавікі па карце межы Беларусі, пры гэтым цалкам ігнаруючы беларусаў як народ, так і "цэнтр" па сталіцы ганялі, што мяч па футбольным полі, не звяртаючы ўвагі на тое, якім болем адгукалася гэтае ўмяшанне ў жывую тканіну вуліц і пляцаў, якімі культурніцкімі, маральнымі і эканамічнымі стратамі суправаджаецца. "Сацыялістычны" горад у перспектыве мусіў пахаваць пад сабою рэшткі беларускай нацыянальнай гісторыі. Не выпадкова будаўніцтва "новага" Мінска спалучалася з метадычным разбурэннем гістарычнага цэнтра горада.

Іншы раз падумаеш, ці не ёсць страта шэрагу старасвецкіх архітэктурных каштоўнасцяў, якой суправаджаласяператварэнне губернскага горада Мінска ў сталіцу хоць і савецкай, але ўсё ж Беларускай Рэспублікі, платаю за імклівую кар'еру? Страціць "душу" горада — гістарычны цэнтр, каб узамен прыдбаць сталічны "імідж", увасоблены ў прадстаўнічым праспекце Сталіна? Можа, нашай сітуацыі пасуе біблейскае выслоўе "Які сэнс у валадаранні над іншымі, калі ты страціў уласную душу?" Пытанне рытарычнае...

Насамрэч усё не так трагічна, мы нават маем падставы для асцярожнага аптымізму. Калі ў 1919 годзе Мінск прызначылі быць сталіцай Рэспублікі, цэнтр горада месціўся менавіта там, дзе яму і належыць быць. Сюды ж, калі Рэспубліка заваявала рэальны суверэнітэт, ён нарэшце і вяртаецца пасля блуканняў. Замкнулася кола, так бы мовіць. Цяпер менавіта сюды, да ратушы, мінчукі водзяць гасцей, каб паказаць "сапраўдны" Мінск. Недзе ў 70-х, калі толькі пачыналася гаворка пра магчымую адбудову Верхняга горада, можна было пачуць меркаванні, што Старому Мінску ў лепшым выпадку наканавана быць прыдаткам Палаца Рэспублікі і Кастрычніцкай плошчы. Сёння ж відавочна, што нават калі з манументальных будынкаў Верхняга горада адноўлены толькі касцёл Марыі-Панны і гарадская ратуша, па эмацыянальным уздеянні гістарычны цэнтр пераважвае ўсё створанае ў Мінску за больш як семдзесят савецкіх год. Так што мы яшчэ пабачым, хто каму прыдатак.

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.**

ЗАЗЕРКАЛЬЕ

# «Водородная бомба»... в багажнике

*Запасы нефти и газа на планете постепенно истощаются. О перспективах развития водородной энергетики рассуждают немецкие ученые З.Нойберт (Германский институт политики развития, Бонн) и В.Шойманн (Технический университет, Берлин).*




Мировая экономика вступает в *последнюю фазу второй промышленной революции*. Этот период начался в первые годы XX столетия с трансформации, вызванной переходом от угля, пара и железнодорожного транспорта к нефти, двигателю внутреннего сгорания, автомобилю и электрификации.

Геологи говорят, что в период с 2010 по 2037 год будет достигнут поворотный пункт в глобальном производстве нефти, возвещающий о начале конца ее эры. Поворотный пункт соотносится с тем моментом, когда будет использована половина уже разведанных или еще намеченных к разведке запасов относительно дешевой нефти. По достижению этой точки цены катастрофически устремятся вверх. Прямые и косвенные затраты на обеспечение нефтеснабжения, а также расходы, которые необходимо будет понести для страхования мировой экономики от экологического и экономического ущерба, видимо, еще больше затормозят мировое экономическое развитие.

Сегодня мы на пути к новому энергетическому режиму, который фундаментальным образом изменит наш образ жизни. Уже намечается коммерческое использование водорода и технологии топливных элементов, которая в случае широкого распространения окажет на экономику большее воздействие, чем любая другая разработка в последующие полвека.

Водород имеется повсюду, но в природе не встречается в чистом виде: его необходимо извлекать из углеводорода или воды. Пока самый оптимальный по затратам способ производства водорода заключается в его выделении из природного газа с помощью пара. Однако природный газ так же, как и нефть, относится к невозобновляемым источникам энергии. Но существует и другая возможность производства водорода, где технологический процесс не требует использовать ископаемое топливо.

Возобновляемая энергия различных видов — фотогальванические элементы, ветер, вода, геотермальные источники и биомасса — будет все больше применяться для производства электроэнергии. В свою очередь электроэнергию можно использовать для того, чтобы в процессе электролиза разделить воду на кислород и водород. Произведенный таким образом водород можно хранить и использовать по мере необходимости для производства электроэнергии.

Главной проблемой экономичности возобновляемой энергии является ее хранение. Производство энергии возможно только, когда солнце светит, ветер дует или вода течет. Однако если часть производимой энергии использовать для выделения из воды водорода, который можно накапливать для дальнейшего потребления, то будет обеспечена непрерывная подача тока.

Работающие на водороде топливные элементы в два с половиной раза эффективнее двигателей внутреннего сгорания. Прибавим сюда, что прямые и косвенные расходы на нефть и газ на мировых рынках будут повышаться. Ввиду того, что цены на возобновляемую энергию и водород станут снижаться, а цены на ископаемое топливо расти, устаревший энергетический режим будет объективно содействовать наступлению новой энергетической эпохи.

Работающие на водороде топливные элементы уже сегодня предлагаются на рынке для использования в домашних хозяйствах, офисах и в промышленности. Крупные автомобилестроительные фирмы инвестируют миллиарды долларов в проектирование работающих на водороде автомобилей. Бесспорно, что водородная экономика позволит осуществить гигантское перераспределение энергии с далеко идущими позитивными последствиями для общества. В эпоху топливных элементов, к примеру, автомобили сами смогут стать "электростанциями на колесах". Водород обладает потенциалом, позволяющим покончить с зависимостью мира от импорта нефти и способствовать разрядке опасных геополитических "игр". Возможно будет также сократить эмиссию углекислого газа и ослабить парниковый эффект.

В сентябре 2002 года Европейский Союз объявил о долгосрочном плане перехода к "водородной экономике". Германская автомобилестроительная промышленность уже идет по пути разработки машин, приводимых в движение энергией водорода. Первые такие серийно произведенные автомобили появятся на рынке предположительно через семь лет. Инвестиции в водородную экономику вдохнут новую жизнь в рынки капиталов, повысят производительность труда и создадут новые экспортные рынки.

Переход к эпохе водорода представляет собой первую реальную надежду на создание устойчивой мировой экономики для будущих поколений. Благодаря удалению углекислого газа из "экономического уравнения" водородная экономика совершит качественный скачок вперед в деле уменьшения глобального парникового эффекта.

Мы живем в канун суперэнергетической эпохи и станем свидетелями нового открытия водорода — вещества, из которого состоят звезды и Солнце.

*(Internationale Politik.)*

## Паедзем у Польшчу

Пачаў дзейнічаць новы парадак уезду замежных грамадзян на тэрыторыю Польшчы.

Як паведамляе прэс-служба МЗС Беларусі, у адпаведнасці з ім замежны грамадзянін, які ўязджае на тэрыторыю Польшчы, павінен прад'явіць пагранічным войскам страхавы поліс, што пакрывае ў выпадку неабходнасці кошт лячэння ў Польшчы, альбо арыгінал запрашэння.

У выпадку адсутнасці згаданых дакументаў замежны грамадзянін павінен прад'явіць пры ўздзе ў Польшчу суму ў памеры не менш за 300 злотых на кожны дзень знаходжання ў Польшчы альбо раўназначную квоту ў замежнай валюце. Пацвярджэннем наяўнасці фінансавых сродкаў могуць быць: адкрыты рахунак у польскім банку, а таксама наяўнасць сапраўднай плацёжнай банкаўскай карткі.

Новы парадак перамяшчэння праз беларуска-польскую мяжу распаўсюджваецца на ўсе катэгорыі грамадзян Рэспублікі Беларусь, у тым ліку тых, хто ўжо мае польскія візы, выдадзеныя раней. Выключэнне складаюць толькі грамадзяне, якія перамяшчаюцца праз тэрыторыю Польшчы транзітам.

**Андрэй СЕРАДА.**

## Астанкі воінаў перапахаваюць у вёсцы Вялікі Трасцянец

Астанкі воінаў Савецкай Арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пахаваныя ў брацкай магіле ля 10-га кіламетра Магілёўскай шашы пад Мінскам, будуць перапахаваныя ля абеліска з Вечным агнём у вёсцы Вялікі Трасцянец.

Такое рашэнне прынята Мінскім гарвыканкамам у сувязі з рэканструкцыяй Магілёўскай шашы ад Мінскай кальцавой аўтадарогі да вуліцы Сяліцкага (мікраён "Шабаны").

Да 3 ліпеня павінны быць завершаны работы па капітальным рамонце абеліска, Вечнага агню, лесвічных маршаў і падыходаў да абеліска у Вялікім Трасцянцы, а само перапахаванне і добраўпарадкаванне прылеглага паркавага ўчастка выканана да 1 лістапада. Эксгумацыя астанкаў воінаў будзе ажыццяўляцца 52-м асобным спецыялізаваным батальёнам Міністэрства абароны, цырымонію перапахавання з адпаведнымі воінскімі ўшанаваннямі правядзе абласны ваенны камісарыят.

**Лавінія АРЭШКА.**

## «Кінавідэапракат» запрашае...

Унітарнае прадпрыемства "Кінавідэапракат" Мінгарвыканкама падрыхтавала шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

5 мая ў кінатэатры "Мір" адбудзецца мерапрыемства "І памятае выратаваны свет...". У праграме — фільм-канцэрт Дзяржаўнага ансамбля "Песняры" "Праз усю вайну", дэманстрацыя мастацкай стужкі "Апошні крок" і сустрэча з выканаўцам галоўнай ролі Віталем Катавіцкім.

6 мая ў 14 гадзін у кінатэатры "Камсамолец" адбудзецца прэм'ера дакументальнага відэафільма "Імя Баграціёна" рэжысёра Ігара Чацверыкова.

З 19 красавіка па 11 мая ў кінатэатрах Мінска праводзіцца агульнагарадская акцыя "Кінапарад Перамогі", у якую ўваходзяць кінапаказы "Айчыны слава баявая". У фае кінатэатраў арганізуюцца фотавыставы, выставы плакатаў і дзіцячага малюнка.

Для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны прадугледжана бясплатнае наведванне кінасеансаў.

**Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.**

## ДАІ будзе шукаць аўталэдзі

У рамках акцыі, што праводзіцца з 26 красавіка сумесна Упраўленнем Дзяржаўтаінспекцыі МУС Беларусі і "Альфа Радыё", 6 мая аб'яўляецца ў Мінску "Днём ДАІ на "Аўталэдзі-2004".

Як паведамілі БелаПАН ва Упраўленні ДАІ МУС, парадак правядзення акцыі наступны. Штодня фірменны аўтамабіль "Альфа Радыё" знаходзіцца на пэўнай стаянцы (інфармацыя аб месцах стаянкі даецца кожную гадзіну ў эфіры "Альфа Радыё" ў выглядзе прамой інфармацыі, а таксама ў прамых уключэннях з месца стаянкі), жанчынам прапануецца ўдзельнічаць у акцыі "Аўталэдзі". Для ўдзелу неабходна сфатаграфавацца на лічбавы фотаапарат, запоўніць купон удзельніцы акцыі, прывезці яго ў гандлёвы цэнтр "Еўропа" (вул. Сурганава, 57а).

Прызам ад ДАІ для пераможцы стане запрашэнне ўзяць удзел у здымках сацыяльнага відэароліка па бяспецы дарожнага руху.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ.**

## «Альфа Радыё» — пераможца па боўлінгу

Каманда "Альфа Радыё", набраўшы 748 ачкоў, стала пераможцам пятага адкрытага чэмпіянату па боўлінгу сярод прадстаўнікоў СМІ "Шаравая маланка", што праходзіў у мінскім "Мэдзісан-клубе".

Другое месца заняла каманда газеты "Магазин кроссвордов", якая набрала 697 ачкоў, трэцяе — газета "Экспресс-Новости" (687 ачкоў).

У спаборніцтве ўзяла ўдзел рэкордная колькасць каманд — 42, якія прадстаўляюць розныя газеты, часопісы, радыёстанцыі і тэлеканалы Беларусі. Арганізатарамі чэмпіянату выступілі ЗАТ "БелКП-ПРЭС" і "Альфа Радыё" пры падтрымцы Беларускай федэрацыі боўлінгу.

**Вольга АСІПЕНКА.**

# Примерка европейского пьедестала

12-й чемпионат Беларуси по тяжелой атлетике среди ветеранов, который прошел на Гродненщине (в Сморгони), получился самым представительным — более сорока участников съехались со всех областей республики и Минска.

Десять ветеранов участвовали в подобных соревнованиях впервые. Возобновили тренировки и достойно отметились на помосте мастера спорта международного класса Владимир Хлуд из Пинска, Александр Абрамович, Леонид Лобачев из Могилева и Олег Чуваков из Бреста. А если к этой именитой дружине добавить еще международников Олега Козлова и Альберта Тимербаева, давно уже выступающих на ветеранских турнирах, да и остальных любителей железной игры, то команда Беларуси на любом чемпионате Европы и мира просто не имеет права остаться без достаточного количества личных наград и высокого командного места. Что и было, кстати, подтверждено в прошлом году на чемпионате Европы в Бордо (Франция), где наши "дедки" завоевали 7 медалей и заняли 6-е командное место в списке из 30 стран.

Сморгонский этап отличался высоким накалом борьбы как в личном, так и в командном первенстве: была внесена 41 поправка в таблицу рекордов РБ.

Среди них следует отметить и три высших мировых достижения, принадлежащих отныне белорусам: в весовой категория 69 кг — минчанина Эдуарда Жигалко, которому, к слову, на днях исполняется 70 лет (Эдуард Михайлович поднял в рывке 70кг); сорокалетнему Альберту Тимербаеву из Гродно (весовая категория 85 кг), установившему два рекорда: в рывке — 132,5 кг и в сумме — 287,5 кг.

В хорошей форме находится и четырехкратный чемпион Европы, "ветеран среди ветеранов", 76-летний минчанин Виктор Ковалев, обновивший собственный рекорд континента в толчке — 70,5 кг.

В упорной борьбе с минимальным перевесом всего в 3 очка уже третий год подряд командный Кубок снова завоевала команда Брестской области. И все это во многом благодаря большим организаторским способностям Николая Конюшика (ему в следующем году исполняется 60 лет), который объединил и сплотил вокруг себя два десятка атлетов. Второе место у минчан, третье — у команды Могилевской области.

В абсолютном зачете *(снимок на 1-й стр.)* места распределились следующим образом: Альберт Тимербаев, Эдуард Жигалко, Александр Щербатов (он поднял в толчке самую "тяжелую" штангу чемпионата — 167,5 кг), Александр Молочко, Владимир Хлуд, Владимир Кавецкий, Александр Абрамович, Леонид Ягниш, Станислав Красовский, Олег Козлов, Анатолий Пошелюк.

Прошедший турнир стал генеральной репетицией белорусских силачей перед чемпионатом Европы, который пройдет в конце мая в Польше, где честь нашей страны будет отстаивать 20 атлетов-ветеранов. Они-то не подведут.

**Владимир ДОВЖЕНКО.**

*P.S. Участники чемпионата благодарят директора сморгонской ДЮСШ Валерия Юрченко и тренера этой же школы по тяжелой атлетике Станислава Красовского за отличную организацию соревнований.*

# «На недельку до второго, я уеду в Комарово...»

## Расписание движения минских электричек на май 2004 года

### На Молодечно

**Отправление со ст.Минск-Пассажирский**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Молодечно | 4.37 | ежед. | б/о Лебяжий, М.Море, Крыжовка, Зеленое, Хмелевка, Анусино, Вязынка, Пролески |
| Молодечно | 5.21 | ежед. | б/о Лебяжий |
| Олехновичи | 5.57 | ежед. | б/о Лебяжий, Зеленое, Хмелевка, Вязынка, Романы |
| Молодечно | 6.39 | ежед. | б/о Лебяжий, М.Море, Крыжовка, Анусино |
| Олехновичи | 6.48 | ежед. | б/о Лебяжий, Крыжовка, Зеленое, Хмелевка, Вязынка |
| Олехновичи | 7.11 | вых. | везде |
| Олехновичи | 7.20 | суб. | везде |
| Молодечно | 7.33 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 7.46 | вых. | везде |
| Молодечно | 8.20 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 8.35 | вых. | везде |
| Ждановичи | 8.51 | ежед.,кроме понед. | С ост.по о.п.Лебяжий |
| Молодечно | 8.58 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 9.22 | вых. | везде |
| Олехновичи | 9.47 | суб. | б/о М.Море |
| Молодечно | 10.00 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 10.23 | суб. | везде |
| Молодечно | 11.11 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 11.42 | суб. | везде |
| Молодечно | 12.38 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 12.51 | вскр. | везде |
| Олехновичи | 13.20 | вых. | везде |
| Молодечно | 13.34 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 14.07 | вскр. | везде |
| Олехновичи | 14.37 | вых. | везде |
| Молодечно | 14.58 | вых., пт. | б/о М.Море, Хмелевка, Пролески, Романы, Криница, Селивановка |
| Олехновичи | 15.13 | вскр. | везде |
| Молодечно | 15.31 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 15.43 | вых. | везде |
| Олехновичи | 16.06 | вых. | везде |
| Молодечно | 16.34 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 16.44 | пт., вых. | везде |
| Олехновичи | 17.19 | раб. | везде |
| Молодечно | 17.34 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 17.59 | вскр., пт | везде |
| Олехновичи | 18.27 | раб. суб. | везде |
| Молод ечно | 19.02 | ежед. скор. | б/о М.Море, Крыжовка, Зеленое, Хмелевка, Анусино, Вязынка, Пролески, Романы, Бояры, Лоси, Мясота, Татарщизна, Криница, Селивановка |
| Молодечно | 19.16 | ежед. | везде |
| Олехновичи | 20.10 | ежед. | везде |
| Молодечно | 20.36 | ежед. | б/о Селивановка |
| Молодечно | 22.01 | ежед. | б/о Лебяжий, Мясота, Татарщизна, Криница, Селивановка |
| Молодечно | 23.47 | ежед. | б/о Лебяжий, до ст.Беларусь — везде, далее с ост. по станциям и о.п. Лоси, Фестивальный; по субботам + ост. по о.п. Мясота, Криница |

### На Барановичи

**Отправление со ст.Минск-Пассажирский**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Барановичи | 4.00 | ежед. | б/о Птичь, Волчковичи, Бережа, Пятигорье, Станьково, Клыповщина, Асино, Мезиновка, Отцеда, Кучкуны, Темные Ляды |
| Столбцы | 5.52 | ежед. | везде |
| Столбцы | 6.36 | ежед. | везде |
| Барановичи | 7.05 | вых. | везде |
| Барановичи | 7.55 | ежед. | везде |
| Столбцы | 8.19 | ежед. | везде |
| Столбцы | 9.02 | вых. | везде |
| Брест | 10.11 | ежед. | везде |
| Барановичи | 11.34 | вых. | везде |
| Брест | 13.02 | ежед. | б/о Птичь, Волчковичи, Бережа, Пятигорье, Станьково, Клыповщина, Асино, Мезиновка, Отцеда, Кучкуны, Темные Ляды |
| Столбцы | 13.37 | суб. | везде |
| Барановичи | 15.35 | ежед. | с ост. по о.п. Курасовщина, ст.Помыслище, Фаниполь, Койданово, Негорелое, Колосово, Столбцы, Городея, Погорельцы, о.п.Пост 1 |
| Столбцы | 16.29 | пт., вых. | б/о Птичь, Станьково |
| Столбцы | 17.46 | ежед. | везде |
| Столбцы | 18.24 | ежед. | везде |
| Барановичи | 19.11 | ежед. | везде |
| Барановичи | 20.22 | ежед. | до ст. Столбцы — везде, далее с ост. по станциям и о.п.Пост 1 |

**Отправление с о.п. Институт культуры**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Брест | 0.53 | ежед. | до ст. Помыслище — везде, далее с ост. по станциям и о.п. Энергетик |
| Койданово (с о.п.Столичный) | 6.17 | раб. | с ост. о.п.Курасовщина, далее — по станциям |
| Столбцы | 7.44 | вых. | везде |
| Столбцы | 9.24 | ежед. | везде |
| Столбцы | 9.54 | суб. | везде |
| Столбцы | 12.09 | вых. | везде |
| Столбцы | 12.43 | ежед. | везде |
| Барановичи | 14.11 | ежед. | везде |
| Городея | 14.36 | пт.,вых. | везде |
| Столбцы | 15.09 | ежед. | везде |
| Брест | 16.10 | ежед. | везде |
| Барановичи | 16.57 | ежед. | б/о Отцеда |
| Колосово | 18.09 | пт.,вскр. | везде |
| Столбцы | 21.27 | ежед. | везде |
| Столбцы | 22.50 | ежед. | б/о Асино, Мезиновка, Темные Ляды |

### На Оршу

**Отправление со ст. Минск-Пассажирский**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Борисов | 4.59 | ежед. | б/о Садовый, Слобода, Домашаны, Загорье, Барсуки, Пр. Победа |
| Борисов | 8.41 | ежед. | везде |

**Отправление с о.п. Институт культуры**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Крупки | 5.18 | ежед. | везде |
| Орша | 6.29 | ежед. | везде |
| Борисов | 7.20 | ежед. | везде |
| Смолевичи | 7.34 | вых. | везде |
| Борисов | 8.10 | ежед. | везде |
| Орша | 9.11 | вых. | везде |
| Толочин | 9.54 | вых. | везде |
| Орша | 11.00 | ежед. | везде |
| Орша | 13.06 | ежед. | б/о Садовый, Слобода, Загорье, Барсуки, Пр. Победа, Красновка, Голошевка |
| Борисов | 13.44 | раб. | везде |
| Орша | 13.44 | вых. | до ст. Бобр — везде, далее с ост. по станциям |
| Борисов | 14.20 | вых. | везде |
| Орша | 14.49 | ежед. | везде |
| Крупки | 16.17 | ежед. | везде |
| Борисов | 17.36 | ежед. | везде |
| Орша | 18.21 | ежед. | везде |
| Борисов | 19.17 | ежед. | везде |
| Борисов | 20.26 | ежед. | везде |
| Борисов | 22.59 | ежед. | б/о Барсуки, Пр. Победа |
| Орша | 22.59 | пт. | до ст. Борисов, б/о Барсуки, Пр. Победа, далее с ост. по станциям и о.п.Новая Жизнь |

**Отправление со ст. Минск-Восточный**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Борисов | 9.50 | вых. | везде |
| Борисов | 10.37 | вых. | везде |
| Борисов | 12.12 | ежед. | везде |
| Борисов | 12.42 | пт.,вых. | везде |
| Борисов | 15.46 | пт.,вых. | везде |
| Борисов | 17.09 | ежед. | везде |
| Орша | 22.02 | ежед. | везде, стоянка на ст. Борисов 4 ч. 22 мин., прибытие в Оршу в 7.02 |

### На Осиповичи

**Отправление со ст. Минск-Пассажирский**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Осиповичи | 0.20 | ежед. | б/о Железнодорожный, до ст.Руденск — везде, далее с ост. по станциям и о.п. Юбилейный, Новое Село |
| Осиповичи | 5.02 | ежед. | б/о Железнодорожный, Верхи |
| Пуховичи | 6.05 | ежед. | б/о Железнодорожный, Асеевка, Равнополье, Дричин, Техникум |
| Осиповичи | 6.14 | ежед. | б/о Железнодорожный, Седча, Зазерка, Н. Село, Вендеж, Верхи |
| Осиповичи | 6.55 | ежед. | везде |
| Пуховичи | 7.12 | суб. | б/о Железнодорожный |
| Осиповичи | 7.56 | ежед. | везде |
| Талька | 8.08 | вых. | б/о Железнодорожный |
| Осиповичи | 8.33 | ежед. | везде |
| Талька | 9.04 | вых. | везде |
| Осиповичи | 9.28 | ежед. | б/о Верхи |
| Талька | 10.12 | вых. | везде |
| Осиповичи | 10.35 | вых. | б/о Асеевка, Зазерка, Рыбцы, Н.Село, Вендеж, Веленский, Верхи |
| Пуховичи | 10.58 | суб. | б/о Железнодорожный |
| Осиповичи | 11.32 | ежед. | б/о Верхи |
| Осиповичи | 12.01 | ежед. | б/о Верхи |
| Талька | 12.50 | вых. | б/о Верхи |
| Осиповичи | 13.22 | ежед. | везде |
| Талька | 13.42 | вскр. | б/о Железнодорожный |
| Осиповичи | 13.56 | ежед. | везде |
| Осиповичи | 14.57 | ежед. | везде |
| Пуховичи | 15.42 | вскр. | везде |
| Осиповичи | 16.09 | вых. | б/о Железнодорожный, Асеевка, Зазерка, Рыбцы, Вендеж |
| Талька | 16.25 | ежед. | везде |
| Пуховичи | 17.00 | вскр. | б/о Асеевка, Зазерка, Рыбцы, Равнополье, Дричин, Вендеж |
| Талька | 17.24 | ежед. | б/о Железнодорожный |
| Осиповичи | 17.32 | ежед. | везде |
| Талька | 18.00 | пт., вскр. | везде |
| Осиповичи | 18.23 | ежед. | везде |
| Талька | 18.58 | пт.,вскр. | б/о Железнодорожный, Асеевка, Рыбцы, Вендеж |
| Осиповичи | 19.26 | ежед. | везде |
| Осиповичи | 20.55 | ежед. | б/о Верхи |
| Осиповичи | 22.23 | ежед. | б/о Вендеж, Веленский, Веселовский, Верхи, Советский |

**Отправление с о.п. Институт культуры**

| НАПРАВЛЕНИЕ | ОТПР. | ДНИ | ОСТАНОВКИ |
|---|---|---|---|
| Пуховичи | 8.45 | вых. | б/о Железнодорожный, Зазерка |

ВІНШУЕМ!

# «Мой сакрэт даўгалецця вельмі просты — усё жыццё працавала ды ела бульбу, хлеб і сала...»

*У Кнізе рэкордаў Гінэса званне самай старой жыхаркі планеты носіць 113-гадовая японка Ура Каяма. Сёння мінчанка* ***Ганна Адамаўна БАРЫСЕВІЧ*** *адзначае сваё 116-годдзе.*

...Ля прыватнага дома мяне ўжо сустракае дачка Ганны Адамаўны — Ніна Іпалітаўна.

*"Праходзьце, праходзьце,* — запрашае яна ў пакой. — *Маці ж зараз на вуліцу амаль не выходзіць, вось ужо год як яна практычна згубіла зрок. Сілуэты бачыць — і ўсё".*

Ганна Адамаўна, між тым, перш-наперш здзіўляе сваёй жвавасцю. Крыху пазней — выдатнай памяццю на падзеі стагодняй даўніны.

— Нарадзілася я ў 1888 годзе на хутары Буда, ля Чэрвеня, — пачынае мая суразмоўца. — Маці памерла, калі мне было чатыры месяцы, так што бацьку аднаму давялося гадаваць мяне і дваіх маіх братоў. Жылі там у пана, працавалі. Праўда, пан памёр хутка, засталася толькі пані з дзецьмі.

На жыццё і пані Ганна Адамаўна асабліва не скардзіцца, хоць палову збожжа ёй і даводзілася аддаваць. Але ж і не галадалі — былі і хлеб, і сала, і дзве каровы трымалі. Каня пані давала, жылі таксама ў яе маёнтку. Цэлы дзень — праца, праца і праца... Дзе там было пра грамату і пісьменнасць думаць. Тым больш, што *"цар тады жанчынам не дазваляў вучыцца".*

**— Ці помніце Вы цара?** — пытаюся ў Ганны Адамаўны.

— Ну, канешне, але ж я яго, Мікалая, толькі на картачцы бачыла.

**— А пра рэвалюцыю што чулі?**

— Чула, але ж зноў-такі не была на той рэвалюцыі. Абвясцілі — і ўсё. Пра Леніна расказвалі, як ён хаваўся, і казалі, што зараз раздасць зямлю беднякам. У аднаго з нашай вёскі (мы тады ўжо пераехалі ў Старыя Коўці, што ў Бярэзінскім раёне) прапала карова, дык яму паабяцалі вярнуць, калі пойдзе за рэвалюцыю ваяваць. Пані нашу тады адразу ж некуды выслалі, а мы падаліся ў калгас. Зямлю, праўда, нашу таксама забралі — пакінулі толькі 60 сотак.

Неўзабаве адбылася "рэвалюцыя" і ў асабістым жыцці Ганны. Кавалераў, якія заляцаліся да яе, хапала, аднак вельмі ўжо даспадобы прыйшоўся статны Іпаліт з іх жа вёскі. Гэта зараз хлопец з дзяўчынай перш чым пажаніцца *"некалькі гадоў прыцiраюцца, каб лепш пазнаць адзін аднаго",* а раней усё было куды прасцей. Р-раз — і ў "дамкі"! Іпаліт дзейнічаў па такім жа прынцыпе. Падышоў да Ганны, прапанаваў выйсці за яго замуж, на наступны дзень ужо распісаліся.

*"Бядняк мой жаніх быў — усяго 7 гектараў зямлі,* — успамінае Ганна Адамаўна. — *Ці ж гэта багацце? Таму і вяселле ніякае не рабілі — ні табе баяніста, ні табе гарманіста. Увечары сабраліся, па чарцы выпілі — ды і ўсё гулянне. Я ж таксама была небагатая — адна сукенка на ўсе дні. Памятаю, на вечарынцы заб'юся ў куток ля парога і стаю там, каб не бачылі маё зрэбнае адзенне".*

Разам Ганна і Іпаліт пражылі ўсяго 13 гадоў. У адзін дзень, у сумнавядомым 37-м, у іх сям'ю прыйшоў міліцыянер і сказаў, каб Іпаліт збіраўся. Ганну запэўніў, што забірае яе мужа ўсяго на некалькі гадзін "для гутаркі". Апошні таксама супакойваў жонку: "Усё будзе добра, я вярнуся. За мной аніякага граху супраць улады няма".

*"Пасля я ўжо даведалася, што паклёп напісаў адзін чыноўнік,* — кажа Ганна Адамаўна. — *Мужа адвезлі спачатку ў раён, аб'явілі ворагам народа, а затым нават і не ведаю куды адправілі далей — ні звестак, ні пісем ад яго не было аніякіх. Затым даведалася, што яго пасмяротна рэабіліціравалі".*

Так Ганна засталася адна з трыма дзецьмі на руках — сынам і дочкамі. Вайна толькі дабавіла ў сям'ю гора і цяжкасцей. Не было сала, малака, цыбулі, солі. Соль замяняла салёнае ўдабрэнне — размочвала яго і дабаўляла ў суп. Праўда, Ганне крыху пашэнціла — зімой у вёсцы кватараваліся партызаны, і ў яе хаце спыніўся камандзір атрада. Калі-нікалі і мясам частаваў сям'ю. Затое сын Ганны вазіў камандзіра на сваім кані да дзяўчат у суседнюю вёску.

*"Аднаго разу думала, што немцы, якія рабілі аблаву на партызан, ужо сабраліся вёску паліць,* — рассказвае суразмоўца. — *Гляджу праз акно — цягнуць да хаты пук саломы. А пасля высветлілася, што немец немца выпадкова падстрэліў, дык фрыцу падсцілку неслі".*

Вайну перажылі, Ганна зноў пайшла ў калгас, дзе і працавала амаль да 90 гадоў. Зімой прыязджала да дачкі ў Мінск, вясной вярталася ў Старыя Койці, і брыгадзір адразу ж прасіў: "Адамаўна, сама ведаеш, што людзей не хапае, дапамажы". І Адамаўна перабірала бульбу, падграбала салому, выкідвала камяні з бульбакапалкі, таптала стагі... За працай пра тое, каб выйсці другі раз замуж, нават і не задумвалася.

— А навошта мне тыя мужыкі, — кажа яна. — Сваталіся, але я не хацела, каб маімі дзецьмі чужы чалавек камандаваў. Сама ж я магла і плот загарадзіць, і арала сама, і сеяла. Здароўе дазваляла.

**— А як зараз са здароўем?**

— Ды нішто сабе — толькі бачыць дрэнна стала. Вось мая бабуля, бацькава маці, дык тая аж да 113 гадоў жыла і ў акулярах чытала. Апошнім часам у мяне яшчэ галава ўсё часцей баліць і кружыцца — як быццам на той свет лячу. Але доктарка прыходзіць, таблеткі выпісвае, хоць раней я іх ніколі не піла і ў бальніцы ніводнага разу не ляжала. Раней жа як было? Захварэў — наламаў малінніку, запарыў ліпавага суквецця, папіў такога адвару і ўсе хваробы як рукой здымае. Але ж гады бяруць сваё.

**— Вы пражылі такое доўгае жыццё, што ўспамінаецца зараз часцей за ўсё?**

— Што ўспамінаецца? Успамінаю, што калі чалавек здаровы і можа працаваць, то тады яму і весела. А калі ты знямоглы на старасці, то дзе тут да весялосці. Не дай Бог столькі жыць. Зараз вось сяджу дома без працы, толькі тэлевізар ды радыё слухаю.

**— Дык раней усё ж-такі весела жылі?**

— Цяжка, але весела. І гуртамі збіраліся, і спявалі, і танчылі, і на святы выпіць маглі. Ды я і зараз чарку кульнуць магу — у мяне тады ліхаманка праходзіць і арганізм лепш працуе.

**— Ганна Адамаўна, а што патрэбна, каб дажыць да ста гадоў?**

— Працаваць і есці не фабрычнае, а ўсё сваё — бульбу, сала, хлеб, малако. Людзі зараз ядуць дужа шмат усяго смачнага, але не карыснага. Я, напрыклад, ніколі нават не дакраналася да магазіннай каўбасы — толькі вясковую ем. Тая ж каўбаса з магазіна — як мыла! А я ем два разы ў дзень — раніцай малако з бульбай, вечарам — бульбу з салам і кефірам.

**— Унукі, праўнукі — колькі іх у Вас?**

— 6 унукаў, 13 праўнукаў і 2 прапраўнукі.

**— Што ж, яшчэ раз віншуем Вас з Днём нараджэння, і мацуйцеся! Каб праз час адзначыць юбілей.**

— Як Бог дасць!

**Алесь СІВЫ.**

*P.S. Паводле звестак статыстыкі, на сённяшні дзень у Беларусі пражываюць каля 900 чалавек, якім больш за 100 гадоў.*

## Среда, 5 мая

### БТ

**07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Новости.
**07.05, 07.35, 08.10, 08.35** "Доброе утро, Беларусь!".
**07.30, 08.30, 19.55** "Деловая жизнь".
**09.15, 19.10 "Сага о форсайтах".** Сериал.
**10.05, 20.00 "Семнадцать мгновений весны".** Сериал.
**11.10, 17.30 "Богатые и знаменитые".** Сериал.
**12.10, 16.45** "Моя страна".
**12.25 "Люди и звери".** Сериал.
**14.15** "На перекрестках Европы".
**15.10 "Самые, самые, самые".** Сериал.
**16.05** "5х5".
**17.15** "Общественная безопасность".
**18.30** "Кстати".
**21.00** "Панорама".
**21.20** "Без права на жизнь".
**21.40** Футбол. "Челси" — "Монако".
**23.35** "Евровидение-2004".
**23.50** "Дорога к Евро-2004".

### ОНТ

**07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.15** "Наши новости".
**07.05** "Наше утро".
**09.05. 18.10** "Дом". Реалити-шоу.
**09.55** "Не только о футболе".
**10.20** "Дисней-клуб".
**14.55** "Город женщин".
**15.55 "Берег мечты".** Сериал.
**16.50** "Большая стирка".
**19.05 "Клон".** Сериал.
**20.00** "Время".
**21.05 "Как бы не так".** Сериал.
**22.10 "Улицы разбитых фонарей".** Сериал.
**23.30** "Фабрика звезд-4".

### РОССИЯ

**07.45 "Чокнутый профессор-2".** Комедия.
**09.40** "В Городке".
**09.50** "Вести. Дежурная часть".
**10.00, 16.00, 19.00** "Вести".
**10.30, 19.30, 22.15** "Местное время. Вести — Москва".
**10.50** "Что хочет женщина".
**11.50** "Аншлаг".
**16.10 "Госпожа победа".** Сериал.
**17.05 "Комиссар Рекс".** Сериал.
**18.00** "Городок".
**19.50** "Спокойной ночи, малыши!".
**19.55 "Снежная любовь, или Сон в зимнюю ночь".** Комедия.
**22.30** "Дежурный по стране".
**23.30 "Нет пути назад".** Боевик.

### ЛАД

**06.30** EURONEWS.
**08.00, 14.00, 20.00** Новости.
**08.10** "Площадь искусств".
**08.35, 22.05 "Россия молодая".** Сериал.
**09.20** "Ералаш".
**09.35** "Сад мечты".
**10.05, 18.20** "Между нами, женщинами". Тележурнал.
**10.30, 21.15 "Грешная Анхелика".** Сериал.
**11.15, 13.05** "Обычный необычный день".
**11.50 "Белое озеро".** Мелодрама.
**13.35, 16.10** Мультфильмы.
**14.10** "Мультиклуб".
**15.05 "Команда "SOS".** Сериал.
**15.30** "Не зевай!".
**15.40** "Бум". Тележурнал для школьников.
**16.20** "Мой Минск. Ностальгическое путешствие".
**17.00** "Росчерк времени".
**17.15 "Вольный ветер".** Муз.фильм.
**18.40 ""Последний визит".** Детектив.
**20.15** "Колыбельная".

### НТВ

**09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00** "Сегодня".
**09.20, 11.20 "Государственная граница", "Восточный рубеж".** Сериал.
**15.20** "Женский взгляд".
**15.55** "Однажды в России".
**16.25** "Внимание: розыск!".
**17.05** "Неизвестная война".
**18.35 "Разрушитель".** Боевик.
**21.30** "Театр имени СССР".
**22.25 "Улица наслаждений".** Худ.фильм.

### СТВ+RenTV

**06.15, 18.00** "Минщина. Люди, события, факты".
**06.25, 15.35 "Пауэр Рейнджэрс, или Могучие рейнджеры в космосе".** Телесериал.
**06.50** "Ну, погоди". Мультфильмы.
**07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45** "24 часа".
**07.50, 20.00** "СТВ-спорт".
**08.05, 20.15** "Минск и минчане".
**08.15, 23.05** "Технология".
**08.25** "Автопанорма".
**08.45** "Закон и криминал".
**09.00 "Супермозг".** Комедия.
**10.55** "Черный лев". Док.фильм.
**11.30** "Горячий лед".
**12.00** "Час суда".
**13.00** "Дикая планета".
**13.50, 18.30 "Инструктор".** Сериал.
**14.50 "ОБЖ, или Обжегся".** Сериал.
**15.20** Мультфильм.
**16.00** "Веселые баксы".
**16.15** "Тема дня".
**16.50** "Игровой рефлекс".
**17.00 "Медики".** Сериал.
**18.10** "Энергосбережение. Альтернативы нет!".
**20.25** "Добрый вечер, малыш...".
**20.40** "Автопанорама".
**20.55 "Только ты".** Комедия.
**23.15** "Проект "Отражение".
**00.00 "Секретные материалы".** Сериал.
**00.45** "Новости СНГ".

### 8-Й КАНАЛ

**17.30** "Мультпарад" от "Бюргера".
**17.45 "Рижские каникулы".** Худ.фильм.
**19.15** "Диалоги о животных".
**19.25** "К-видео". "Топ-8".
**19.30 "Тени исчезают в полдень".** Сериал.
**20.45** "Вечарніца".
**21.00** "Европа сегодня".
**21.30 "Гнусное предложение".** Мелодрама.

### ТВ ЦЕНТР

**04.45, 06.30** "Настроение".
**07.35** "Газетный дождь".
**07.45 "Нет спасения от любви".** Боевик.
**09.40** "Телемагазин".
**10.00, 13.00, 21.00** "События. Время московское".
**10.15** "Дата".
**11.10** "Момент истины".
**12.05** "Москвички на войне".
**13.25** "Квадратные метры".
**13.15 "Инспектор Кресс".** Сериал.
**14.30** ""Мода non-stop".
**15.00** "Регионы: прямая речь".
**15.30** "Ступеньки".
**16.00 "Уголовная полиция".** Сериал.
**17.15** "Алфавит".
**17.55 "Страсти по Саломее".** Сериал.
**18.50 "Освобождение. Огненная дуга".** Сериал.
**20.40** "Пошехонская быль".
**21.10** Чемпионат мира по хоккею. 1/4 финала.

### EUROSPORT

**09.30** Экстремальный спорт.
**10.00, 18.00, 02.00** Футбол. История чемпионата Европы.
**10.30** Олимпийские игры.
**11.00** Футбол. Евроголы.
**12.00** Футбол. Чемпионат Европы среди юниоров во Франции.
**13.00** Теннис. Турнир в Германии.
**17.30** Футбол. Планета ЕВРО.
**19.00** Снукер. Чемпионат мира в Великобритании.
**21.00** Конный спорт.
**22.00** Гольф. Европейский тур в Италии.
**22.30** Гольф. Тур американской PGA.
**23.30** Мультиспорт.
**23.45** Новости "Евроспорта".
**00.00** Кикбоксинг.

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.**
**E-mail: nv@promedia.by**
**http://nv.promedia.by**

**Індэкс 63222.**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**



Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 490 экз. Заказ № 639.